PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl

№ 1 (2434) Год XLVIII Беласток, 5 студзеня 2003 г. Цана 2,00 зл.

Час на вялікі крок

Падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі мяркуе, што прадпрыемствы, няўрадавыя, урадавыя і самаўрадавыя арганізацыі змогуць выкарыстаць каля 65 працэнтаў сродкаў, якія атрымаем з Еўрасаюза, далучыўшыся да яго.

Маршалак Кшыжэўскі (сувальчанін з СЛД) гэтак прызнаўся ў час прэс-канферэнцыі перад каталіцкімі Калядамі. Пры нагодзе прадставіў сваю прэс-інфарматарку Бажэну Беднарак, дагэтуль працаўніцу Радыё Беласток. Прысутны на канферэнцыі старшыня Падляшскага сейміка Збігнеў Кшывіцкі (да гэтай пары ваяводскі радны і журналіст „Trybuny") падкрэсліў неабходнасць спраўнага пераплыву інфармацыі паміж самаўрадам ваяводскім і павятовымі ды гміннымі ў справе здабывання еўрасаюзных сродкаў.

— Абавязкова трэба стварыць г.зв. абсарбцыйную інфраструктуру, — тлумачыў у сваю чаргу Кшыжэўскі, — значыць, такіх умоў і адпаведных дакументаў, каб як найбольш грошай, плывучых з Еўрасаюза, не прапала.

У 2004-2006 гадах Падляшша мае распараджацца еўрасаюзнымі 220-230 мільёнамі еўра. Больш чым палова мае быць прызначана на структурныя фонды і эканамічную суцэльнасць. Рэшта — на сектарныя праграмы (ведамасныя). Для параўнання: Польшчы ўдалося выкарыстаць 95 працэнтаў грошай перададзеных у рамках Фонду PHARE.

— Ёсць за што змагацца. Падляшша мае шанц зрабіць вялікі крок у той бок, каб спачатку зраўняцца з рэштай Польшчы, — падкрэсліў маршалак.

У першую чаргу, на думку Януша Кшыжэўскага, неабходным будзе наладжанне транспартнай інфраструктуры. Пералічыў сярод гэтых спраў шлях Via Baltica, мадэрнізацыю „дарог смерці" н-р 61 і н-р 19, а таксама пабудову транспартных шляхоў уздоўж усходняй мяжы.

У Маршалкоўскай установе ўзнікнуць два дадатковыя ведамствы (або дэпартамент і бюро), якія будуць займацца пытаннямі звязанымі з далучэннем Польшчы да Еўрасаюза. Мае ў іх працаваць каля 35 асоб (сёння ў Маршалкоўскай управе занята 198 працаўнікоў). Паколькі няма грошай прыняць на працу новых асоб, праўдападобна перавесці іх на іншыя пасады ўнутры ўстановы.

Пры нагодзе маршалак Кшыжэўскі паведаміў, што не будзе павышэння заробкаў у ваяводскай управе (маршалак, двух ягоных намеснікаў, двух членаў управы). Удакладніў, што віцэ-маршалкі маюць зарабляць па 7,5 тыс. зл. брута, а члены ўправы — на 700 злотых менш.

На канец маршалак пажадаў журналістам — а за іх пасрэдніцтвам чытачам, радыёслухачам і тэлегледачам — радасных Каляд.

Мацей Халадоўскі

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Гістарычныя ўборы радзівілаўскай эпохі прэзентавалі гайнаўскія ліцэісткі

Традыцыя не можа быць застылай

У Беларускім музеі ў Гайнаўцы 21 снежня адбылося адкрыццё выстаўкі мастацкіх прац, якія выканалі студэнты Кафедры народных рамёстваў Беларускага універсітэта культуры з Мінска. Універсітэцкія выкладчыкі прывезлі каля 100 студэнцкіх работ, выкананых з выкарыстаннем беларускіх народных матываў, з галіны ганчарства, керамікі, ткацтва, габелена і саломапляцення.

У час мерапрыемства загадчык Кафедры народных рамёстваў прафесар Рыгор Шаур расказаў пра дзейнасць сваёй кафедры і растлумачыў, як былі выкананы мастацкія работы паказаныя на выстаўцы. Звярнуў ён асаблівую ўвагу на ткацкія працы, якіх многа вісела на сценах выставачнай залы. Самыя вялікія работы, названыя аўтарамі „Восеньскія радушкі", выкананы былі з выкарыстаннем матываў з гродзенскіх дываноў. З вопраткай узнагароджанай на конкурсе моды нацыянальнага касцюма, арганізаванага ў Маскве, актыўна знаёмілі дзяўчаты. Апранутыя ў прыгожыя касцюмы хадзілі яны паміж публікай.

— Традыцыя не можа быць застылай і нерухомай. Таму аўтары работ карыстаючыся народнымі матывамі шукаюць новае, — заявіў прафесар Рыгор Шаур.

Вялікім зацікаўленнем гайнавян карысталіся вырабы з саломы, некаторыя з якіх выконваліся нават паўгода. Уразіла вельмі дакладнае выкананне складаных саламяных дэталяў.

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Праф. Рыгор Шаур

— Вельмі аптымістычнае ўражанне застаецца пасля наведання выстаўкі. Студэнты пасля добрай школы ўдала ідуць у напрамку прафесіяналізму. Аднак у выпадку некаторых работ у пошуках уласнага занадта адышлі ад народнага, — сказаў гайнаўскі мастак Віктар Кабац.

Старшыня Грамадскага камітэта пабудовы музея Ян Хіліманюк, які адкрываў мерапрыемства, паінфармаваў, што выстаўку можна наведваць у гадзінах працы музея (у працоўныя дні з 8 да 15 гадз.).

Аляксей Мароз

Віншуем нашых чытачоў з Калядамі! Жадаем Вам шчасця, здароўя, радасці ў жыцці і поспехаў ва ўсіх справах. Рэдакцыя

Помнікі прыроды ў Паўлінове ☞ 3

Калі ў 1939 годзе ўвайшла Чырвоная Армія і на Бугу ўсталявалася граніца, Шульцы падаліся ў Варшаву. Сын Пятра Шульца, Ежы, пазнейшы прафесар хірургіі, а тады афіцэр у званні паручніка, пасля яшчэ па нешта тайком вярнуўся ў Паўлінова. Бадай прыходзіў па закапаныя бацькам каштоўнасці і нешта з сабою забраў.

БСФ распачаў дзейнасць ☞ 4

Самаўрадавыя выбары адбываюцца раз на чатыры гады і тады актывізуецца беларускае асяроддзе. У Беларускім самаўрадавым форуме дзейнічаюць беларускія самаўрадаўцы і людзі зацікаўленыя грамадскай дзейнасцю. Плануем наладзіць супрацоўніцтва паміж Гайнаўшчынай, Бельшчынай і Беласточчынай.

Чэрвень у жніўні ☞ 9

Горад Чэрвень. Тутэйшыя інтэлігенты ўжо вярнуліся да гістарычнай назвы і між сабой кажуць Ігумен. Вядомы ён з 1387 года. Заснавальніцай горада, як кажа легенда, была манахіня з Афона. Першы жаночы манастыр збудаваны на рацэ Ігуменцы, сярод багны. У пятнаццатым стагоддзі Ігумен лічыўся царкоўным горадам.

Памагаюць старэйшым ☞ 9

Перад Раждзественскім постам белгімназісты разам з жыхарамі „Самараніна" арганізавалі запусты. Вучні выступілі з артыстычнай часткай. Салісткі і гімназічны хор заспявалі песні. Найбольш публіцы спадабаліся народныя беларускія песні. У час пачастунку вучні селі за доўгі стол насупраць старэйшых асоб і слухалі цікавыя расказы.

Збамбілі балота ☞ 10

Уцякаў на ўсход і загадчык НКУС з Заблудава. Жонку і сына ён успеў загрузіць на самаход, а сам яшчэ хацеў забраць дачку, якая тады на летніку была. І яны ўжо не ўспелі выехаць, толькі асталіся ў Дзернякове жыць. Немцы яго ўскрылі і загадалі ў Міхалова мельдавацца. Ён у вёсцы гаварыў што ходзіць у Міхалова, але заміж таго ён пачаў хадзіць кругом і арганізаваць партызанку.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Лавіся, дыяспара, вялікая і маленькая!

Беларуская дыяспара атрымоўвае запрашэнні на Кангрэс беларусаў замежжа. Сустрэчы супрацоўнікаў пасольстваў з прадстаўнікамі дыяспары прайшлі ў ЗША, Канадзе, Бельгіі і Чэхіі. З прычыны гэтых сустрэч Нью-Йоркскі аддзел Беларуска-амерыканскага задзіночання (гэта адна з найбольшых арганізацый беларусаў у ЗША) прыняў зварот да дыяспараў і беларусаў за граніцай.

У прыватнасці, паведамляецца, што прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Чэхіі сустрэліся з другім сакратаром беларускага пасольства ў Празе спадаром Казловым, які праінфармаваў членаў дыяспары, што ў канцы мая 2003 года ў Мінску па ініцыятыве ўлад пройдзе вышэйзгаданы кангрэс, і прапановы прыняць удзел у ім рассылаюцца ва ўсе арганізацыі беларускай дыяспары ў свеце. Спадар Казлоў, размаўляючы па-беларуску, прапанаваў „наладжваць супрацоўніцтва не на тым, што нас раз'ядноўвае, а на тым, што нас аб'ядноўвае".

Пры гэтым, як сцвярджаецца ў пісьме беларусаў ЗША, атрыманым таксама рэдакцыяй „Белорусских новостей", у час згаданай сустрэчы нічога канкрэтнага не было сказана аб мэтах кангрэса. Прадстаўнікам дыяспары прапанавалася выказацца „ці згодны яны прыняць удзел і якія тэмы хацелі б яны паставіць на разгляд на кангрэсе". Паводле беларусаў ЗША, такі падыход сведчыць аб тым, што „факт удзелу ў кангрэсе для беларускіх улад ледзь не больш важны, чым яго павестка дня, і гэта проста спосаб выкарыстаць дыяспару для стварэння ўражання аб падтрымцы рэжыму дыяспарай".

„Якімі б не былі афіцыйныя мэты кангрэса, якія б абяцанні не давалі прадстаўнікі рэжыму адносна ўмоў удзелу дыяспары, гэта не будзе мець істотнага значэння. Добра вядома, як Лукашэнка і яго памагатыя не стрымоўваюць сваіх слоў і не клапоцяцца аб шанаванні нават элементарных норм прыстойнасці. Інфармацыя заўсёды перадаецца ў скажоным і перавернутым выглядзе, як у нядаўнім выпадку з амерыканскімі кангрэсменамі ў Мінску", — лічаць аўтары пісьма.

У прэс-службе Міністэрства замежных спраў Беларусі паведамілі, што сустрэча другога сакратара пасольства Беларусі ў Чэхіі — усяго ініцыятыва гэтага дыпламатычнага прадстаўніцтва.

— Ідэя правядзення такога кангрэса лунае ў паветры здаўна, — сказаў прадстаўнік МЗС Андрэй Савіных, — яна вылучалася многімі арганізацыямі. МЗС ведае гэтую ініцыятыву, аднак канкрэтных арганізацыйных мер і крокаў не прымала. Дата кангрэса не ўстаноўлена. Пасольствы ў агульным парадку прымаюць дзеянні па вывучэнні меркаванняў адносна гэтага мерапрыемства ў шматлікіх беларускіх дыяспарах і групах за граніцай.

Што ж, тады МЗС тым болей цікава даведацца, якое меркаванне склалася па гэтай прычыне ў амерыканскіх беларусаў. Так вось, паводле беларусаў ЗША, „на сёння няма амаль ніводнай пазіцыі, па якой рэжым і беларуская дыяспара мелі б блізкія погляды".

А паколькі беларусы ЗША не бачаць пунктаў сутыкнення з афіцыйным Мінскам, прапануюць яны заклікаць усе замежныя беларускія арганізацыі і паасобных прадстаўнікоў дыяспары „не мець нічога супольнага з планаванай рэжымам акцыяй пад назвай „Кангрэс беларусаў замежжа", а таксама адмовіцца ад асабістых кантактаў з прадстаўнікамі рэжыму".

Ці многія адгукнуліся на гэты заклік, пакажа час. Але сам факт актывізацыі дыпламатычных кантактаў прадстаўніцтваў з дыяспарай паказальны. Шэраг аналітыкаў выказвае версію, што такім чынам рыхтуецца чарговая прапагандысцкая акцыя, прымеркаваная перш за ўсё да верагоднага рэферэндуму аб магчымасці трэцяга прэзідэнцкага тэрміну. Бо шматлікія „народныя сходы" заўсёды арганізаваліся, каб стварыць уладам фон масавай падтрымкі напярэдадні рэферэндумаў і выбараў. А тут прыцэл ужо на глабальны маштаб. Прадстаўляеце эфект: „Беларусы свету аднадушна падтрымоўваюць..." — і так далей. Толькі ці многа знойдзецца ахвотных з'ехацца з усяго свету для галасавання за падобную рэзалюцыю? Пісьмо з Нью-Йорка падштурхоўвае да скептычнага прагнозу на гэты конт.

Сяргей Пульша

Белорусские новости, 26.12.2002 г.

Рыхтуецца сход інтэлігенцыі

Рабочая група Арганізацыйнага камітэта па скліканні Сходу беларускай інтэлігенцыі звярнулася з заклікам да ўсіх, хто працуе на ніве навукі, культуры, адукацыі, медыцыны, прадпрымальніцтва і ў іншых сферах прыняць удзел у сходзе для абмеркавання сітуацыі, якая склалася ў Беларусі. Сход беларускай інтэлігенцыі мае адбыцца ў канцы студзеня 2003 г. у Мінску.

Найважнейшымі для Беларусі праблемамі арганізатары сходу палічылі захаванне нацыянальнай тоеснасці беларусаў, суверэнітэт і лад дзяржавы, месца Беларусі сярод краін Еўропы і сусветнай супольнасці, прадухіленне эканамічнага і энергетычнага крызісу, ратаванне нацыі ад наступстваў Чарнобыльскай катастрофы і дэмаграфічнага крызісу, удзел у працэсах глабалізацыі, кансалідацыя інтэлігенцыі і яе роля ў грамадстве. Мэта сходу — павярнуць Беларусь на шлях станоўчага, перспектыўнага развіцця.

У звароце адзначаецца, што „сённяшняе, незадавальняючае становішча нашага грамадства склалася ў пэўнай меры і таму, што мы, інтэлігенцыя, не выконваем належным чынам сваю адказную гістарычную місію". Сход мае скансалідаваць намаганні інтэлігенцыі дзеля таго, „каб ясна і цвёрда выказаць нашую думку народу Беларусі, афіцыйным уладам, палітычнай апазіцыі і ўсяму свету". Сябрамі аргкамітэта з'яўляюцца, між іншым, Анатоль Вярцінскі, Вольга Іпатава, Аляксей Кароль, Уладзімір Колас, Уладзімір Конан, Валеры Мазынскі, Алег Трусаў. (вл)

2002 год – заканчэнне казкі

Адышоў у гісторыю яшчэ адзін год. У палітычным жыцці Беларусі ён прынцыпова адрозніваўся ад шмат якіх папярэдніх. Напэўна самым галоўным набыткам беларускай гісторыі стала развянчанне даўняга міфа аб саюзнай дзяржаве. Натуральна, такой, якой прапагандавала яе сённяшняя беларуская ўлада.

Калі падыходзіць з дыялектычных пазіцый, то варта згадзіцца, што кожны чалавек, кожная група людзей, кожны народ жывуць згодна свайму менталітэту, сваім поглядам на рэчаіснасць, сваім уяўленням аб мінулым, сучасным і будучым. Дзейнасць палітыкаў, па вялікім рахунку, заключаецца ў выкарыстанні ў сабе выгадных мэтах гэтых самых народных уяўленняў, каб тым самым працягнуць сваё палітычнае жыццё.

Нягледзячы на тое, што менталітэт нацыі рэч даволі доўгатрываючая, перамены ў народных сімпатыях і антыпатыях да таго ці іншага палітыка такія ж частыя як восеньскі вецер. Бо кожны палітык ёсць чалавекам, поглядзі і дзеянні якога на нейкім этапе перастаюць задавальняць большасць насельніцтва. Таму і праходзіць вымушаная карэкціроўка палітычнага курсу краіны праз дэмакратычныя выбары.

Падчас існавання Савецкага Саюза Беларусь лічылася добраўпарадкаванай рэспублікай. Тут канцэнтраваўся вялікі інтэлектуальны патэнцыял, у першую чаргу, навукова-тэхнічны, моцнай была вытворчасць, якая працавала на вялікую па памерах краіну, а знаходжанне на заходніх рубяжах СССР прыцягвала значную ўвагу ваенна-прамысловага комплексу. Таму распад Савецкага Саюза выклікаў у большасці насельніцтва не радасць ад нечаканага суверэнітэту, а хутчэй жаль па адносна заможным жыцці. Тое, што называецца настальгіяй па мінулым. Таму і пачатак 90-х, г.зн. першыя гады незалежнасці, быў не перыядам развіцця краіны згодна нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў, а быў часам народнай дэзарыентаванасці і мацнеючага страху перад будучыняй.

У такіх варунках, зразумела, сімпатыю насельніцтва мог атрымаць толькі чалавек, які не толькі разганяў гэты страх, абяцаючы пакараць усіх карупцыянераў-„крывасмокаў", але і аднавіць разарваныя эканамічныя сувязі, у першую чаргу, з Расіяй. Пры гэтым людзям не тлумачылася, чаму разарваліся гэтыя сувязі і ці можна сапраўды іх аднавіць ва ўмовах рынкавых адносін. Адначасова новаствораны міф падмацоўваўся рознага кшталту палітычнымі заявамі аб агульных грошах, што будуць выдаваць два галоўныя банкі кожнай краіны Саюза Беларусі і Расіі, а таксама аб суіснаванні дзвюх незалежных дзяржаў у, зноў жа, незалежнай адной.

Да 2000 года такі міф з папулісцкіх мэтаў быў выгадны як лукашэнкаўскай Беларусі, так і ельцынскай Расіі. Але калі першая цярпліва чакала новага СССР, атрымліваючы нафту за пацалункі, то другой не заставалася нічога як наладжваць ліберальныя рэформы і ўсталёўваць рынкавыя адносіны. І ў рэшце рэшт абедзьве суіснуючыя ў нібыта адным саюзе краіны аказаліся не толькі розныя палітычна, але і эканамічна. Больш таго, для Расіі ўздыхі аб былой савецкай велічнасці сталі губляць сэнс, бо на сённяшні дзень гэтая краіна, калі не ва ўсім, то ў вельмі многім пераўзышла самую сябе тых часоў. Сведчаннем чаго стаў усё больш нарастаючы аб'ём продажу зерня за мяжу, чаго не было з 60 гадоў мінулага стагоддзя, і прэфіцыт бюджэту, г.зн. даходы ў дзяржаўную скарбонку пераўзыходзяць выдаткі з яе.

Беларусь тым часам усё больш вярталася да камандна-адміністрацыйных метадаў кіравання, вобразна кажучы, выціскаючы ўсё да апошняй кроплі з тых самых прадпрыемстваў са старэючым абсталяваннем і ледзьве дыхаючых калгасаў. Магчымую змену дзяржаўнага кіраўніцтва і дзяржаўнага курсу блакавала фальсіфікацыя выбараў. Але падтрымліваць такую эканоміку ў рабоце, а таксама тых, хто ёю кіруе дазваляла фінансавая дапамога Расіі.

Аднак кожны капітал імкнецца да распаўсюджання, заваявання новых сфер свайго ўплыву. І гэта ў 2002 годзе стала галоўным чыннікам расійска-беларускага эканамічнага канфлікту, па сутнасці, канфлікту эканамічных сістэм. Асабліва яскрава гэта праявілася ў спробе нацыяналізаваць Беларуссю расійскі нафтаправод, у перашкодах у распаўсюджанні расійскага піва на беларускай тэрыторыі, у нашумелай гісторыі з нежаданнем лукашэнкаўскага кіраўніцтва аддаць пад абяцаную прыватызацыю „Белтрансгаз" — галоўнага пастаўшчыка „блакітнага паліва" ў Беларусі.

На такі паварот справы, калі Расію больш цікавяць эканамічныя выгоды, а не расійска-беларуская палітычная магутнасць у Мінску згаджацца не хацелі. Але знешнепалітычныя абставіны вымусілі. І цяпер беларускі кіраўнік аказаўся ледзьве не ў шэрагах барацьбітоў за незалежнасць і ўжо не кажа пра тое, што ён адзіны галасаваў супраць Белавежскіх пагадненняў, якія канстатавалі смерць СССР. Зразумела, уласны палітычны лёс важней за вузы славянскага братэрства. Але з міфам прыйшлося развітацца, як і з ненароджаным гімнам саюзнай дзяржавы. Праўда гэта зусім не азначае, што цяпер Беларусь чакае хваля абуджанай нацыянальнай самасвядомасці, хутчэй — спаўзанне ў разрад расійскай блізказамежнай перыферыі.

Уладзімір Лапцэвіч

Васіль Быкаў не збіраецца прасіць прытулак у Чэхіі

24 снежня народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў катэгарычна абверг паведамленні СМІ аб тым, што ён нібыта прасіў і атрымаў палітычны прытулак у Чэхіі. У інтэрв'ю РІА „Новости" Васіль Быкаў назваў гэтыя паведамленні „палітычнай правакацыяй". Паводле пісьменніка, ён „ніколі не прасіў і не збіраецца прасіць палітычнага прытулку ў Чэхіі". „Мае палітычныя разнагалоссі з Аляксандрам Лукашэнкам не азначаюць, што я павінен стаць палітэмігрантам", — сказаў Васіль Быкаў. „Від на жыхарства ў Чэхіі і статус палітычнага ўцекача цалкам розныя рэчы,"— патлумачыў пісьменнік Васіль Быкаў і падкрэсліў, што ён „быў і застаецца грамадзянінам сваёй краіны — Беларусі".

Народны пісьменнік Беларусі пераехаў у Чэхію на сталае жыхарства разам са сваёй жонкай. „Мяне тут прынялі вельмі цёпла", — адзначыў ён. Паводле ягоных слоў, ён даўно марыў пасяліцца ў Чэхіі і зараз плануе пачаць вывучаць чэшскую мову.

Апошні час народны пісьменнік Беларусі жыў у ФРГ, а да гэтага ў Фінляндыі.

Навіны Хартыі '97, 26.12.2002 г.

Чаму не прыедуць пагаварыць з намі?

Шкада, што Віктар Бура („Ніва" н-р 47, „Спявай, душа народная, спявай!") не напісаў, хто падстаўляе ногі старшыні ГП БГКТ Яну Сычэўскаму і сакратару ГП Валянціне Ласкевіч. Бо так складваецца ўражанне, што дасягненні былі б куды большыя, калі б не перашкоды з боку ворагаў слаўных дзеячаў БГКТ.

Перад выбарамі ў самаўрады пытаў я жыхароў Махнатага, каго будуць выбіраць, пэўна нашых „хлопцаў" з Беларускіх выбарчых камітэтаў!? — Адказ быў проста шакіруючы: „На тых бандытаў-беларусаў галасаваць не будзем. Яны ж бяруць грошы ад амерыканцаў, каб нашага Лукашэнку скінуць з пасады прэзідэнта. І той, хто спатыкаецца з Новакам-Езяранскім, каб аднавіць Радыё „Рацыя", ніколі не служыць беларускай справе". — „А калі праводзіўся ўсеагульны перапіс насельніцтва, вы, — пытаюся, — якую нацыянальнасць упісалі ў анкету?" — „Вядома, — кажуць — беларускую". Вось табе і на. З аднаго боку беларусы, а з другога — кандыдатаў беларускіх камітэтаў не прызнаюць за сваіх. Можна падазраваць, што агрэсіўная прапаганда, пасеяная на фэстах, прыносіць немалы плён: нянавісць. А што БГКТ мае вялікі вопыт у культурна-асветнай працы — я згодны з Віктарам Бурам. Толькі чаму з такой заядлай нянавісцю выказваліся мае суразмоўцы пра сяброў Беларускага саюза, беларускіх камітэтаў, пра Радыё „Рацыя"?! Адкуль бярэцца злосць і незадавальненне? З таго, што так званая дэмакратыя прынесла самыя шкоды вёсцы? Што не могуць прадаць бульбы, збожжа і што ўсюды ашуканства? Што няма нічога добрага ў сучаснай рэчаіснасці, толькі самое зло. Толькі чаму яно, тое зло, атаясамліваецца з дзейнасцю беларускіх арганізацый розных ад БГКТ? — Ці гэта проста выпадак?

Кепска, што ў мінулым беларусы — гавару пра свядомых беларусаў — не тварылі выбарчых камітэтаў. Добра, што цяпер згуртаваліся і паказалі іншым, што існуе беларуская меншасць. А што ніхто не хоча дзяліцца ўладай — вядома — і таму ўчыніўся вялікі скандал з боку „сяброў" СЛД і іх прыхільнікаў.

З адным сцвярджэннем згаджаюся з маімі суразмоўцамі: „Калі яны, значыць, дзеячы Беларускага саюза, такія беларусы, і хочуць нас прадстаўляць ва ўладах, то чаму не прыедуць і не пагавораць з намі?" Ну і я з імі згодны. Чаму?

Міхась Куптэль

Нараўчанская дэмаграфія

Нараўчанская гміна займае плошчу ў 339 квадратных кіламетраў. Больш чым палавіну яе абшару займаюць лясы, у значнай частцы — Белавежская пушча.

У 35 вёсках і прысёлках Нараўчанскай гміны цяпер пражывае 4 602 чалавекі. Найбольшыя вёскі: Нараўка (яна налічвае 999 жыхароў), Семяноўка (521), Старое Ляўкова (416), Новае Ляўкова (264), Скупава (261), Міклашэва (212), Плянта (193), Альхоўка (160) і Лешукі (156 чалавек). У 1995 годзе гміна налічвала 5 330 асоб, а ў 1980 годзе пражывала тут 6 570 чалавек. У Нараўчанскай гміне больш людзей памірае чым нараджаецца. У 2002 годзе нарадзілася 23 дзяцей, а памерла ажно 80 чалавек. У папярэднія гады пахаванняў было: у 1997 годзе — 78, у 1998 годзе — 66, у 1999 годзе — 71. Жэніцца ў сярэднім 16-18 пар. Найбольш у студзені, маі, верасні і ў кастрычніку.

Бацькі давалі нованароджаным такія імёны: Эрнест, Альберт, Кшыштаф, Тамаш, Матэвуш і Крыст'ян хлопчыкам ды Паўліна, Агата, Анна і Іаанна дзяўчынкам.

Ушаноўваліся пары, якія адзначылі 50 гадоў сумеснага жыцця. Былі гэта: Мікалай і Вера Бірыцкія з Семяноўкі, Канстанцін і Леакадзія Каліноўскія з Мінкоўкі, Васіль і Лідзія Харкевічы са Слабодкі, Мікалай і Марыя Сачко з Гушчэвіны, Пётр і Яўгенія Каліноўскія з Міклашэва, Ян і Лідзія Грыка з Лешукоў ды Ян і Вера Белабжэскія з Міклашэва.

Доўгажыхарамі Нараўчанскай гміны з'яўляюцца: Фяўронія Стоцкая з Бярнацкага Моста (нарадзілася яна ў 1901 годзе), Анна Тамбэрг са Свінарояў (нар. 1902 г.), Вольга Скепка з Баб'яй Гары, Юзаф Шарэйка з Плянты і Анна Кісялеўская са Стачка (усе нар. 1903 г.), Наталля Бірыцкая з Семяноўкі (нар. 1904 г.) ды Вольга Анішчук з Масева і Яўгенія Аліхвер з Семяноўкі (нар. 1905 г.).

Янка Целушэцкі

Якія стаўкі?

12 снежня 2002 г. адбылася сесія Рады гміны ў Чаромсе. Асноўнай тэмай было вызначэнне ставак падаткаў на наступны год, камандзіровачных для радных, солтысаў і месячнай платы старшыні Рады гміны.

Прапанаваныя стаўкі былі прыняты Радай аднагалосна. Дыеты чаромхаўскіх радных засталіся на ўзроўні мінулага года, г.зн. 160 зл. ад кожнай сесіі і пасяджэння камісіі. Солтысам за ўдзел у сесіі прызначана 40 зл. Старшыня Рады гміны будзе атрымоўваць 1 000 зл. у месяц (на 200 зл. менш чым у мінулым годзе). Чаромхаўскія падаткаплацельшчыкі заплацяць 0,51 зл. за кв. метр плошчы жылога будынка (2 грошы больш чым у мінулым годзе), 16,30 зл./м^2 за будынкі прызначаныя на гаспадарчую дзейнасць (раней 15,45 зл.) і 3,46 зл./м^2 ад будынкаў прызначаных на ахову здароўя. Павышаны падатак ад сабак з 30 зл. на 35 зл. у год. Рыначная плата не змяняецца і выносіць 5, 8 і 12 зл. Варта адзначыць, што за 2002 г. (да паловы снежня) у гмінную касу паступіла 18 776 зл. рыначнай платы і 2 130 зл. падатку ад сабак.

Рада гміны вызначыла 11 пунктаў продажу алкагольных напояў вышэй 4,5% на спажыванне па-за месцам продажу і 6 пунктаў на спажыванне ў месцы продажу.

Была прынята прапанова наконт гміннай праграмы прафілактыкі і вырашэння праблем алкагалізму на 2003 год. Была прынята прапанова, што выбары солтысаў у Чаромхаўскай гміне будуць праходзіць ад 1 да 28 лютага 2003 г. (ус)

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Звыш стогадовы дом Шульцаў (на заднім плане)

Помнікі прыроды ў Паўлінове

У сілу распараджэння Падляшскага ваяводы н-р 43/87 ад 4 кастрычніка 1987 г. помнікамі прыроды на тэрыторыі Арлянскай гміны лічацца два дубы ў вёсцы Паўлінова. Растуць яны ў колішнім маёнтку сям'і Шульцаў, якія, як згадваюць мясцовыя людзі, пры цары былі мясцовымі панамі.

Шульцы, якія выводзіліся з Нямеччыны, былі багатымі людзьмі, у іх было 300 гектараў зямлі; поле іх было таксама ў ваколіцы Галадоў і Кнарыд. Пётр Шульц, які быў уладальнікам маёнтка пры цары, меў жонку з Вільні, яна была праваслаўная. Шульцы жылі наперамен у Вільні і Паўлінове.

Мясцовыя людзі да сёння помняць розныя эпізоды з жыцця Шульцаў. Адна бабулька, напрыклад, прыгадала, як у час жніва ці выкопкаў для працы ў маёнтак прыязджала рускае войска. Запамятала тое войска, бо тады ўся вёска танула ў пыле пасля праезду кавалерыйскага атрада.

Два гады назад Уладзімір Талочка, пенсіянер, расказваў мне за сваім цесцем, які быў у Пятра Шульца парабкам, што ўладальнік маёнтка адзін на ўсю ваколіцу меў радыёпрыёмнік і таму ведаў пра надыход вайны. Нічога не гаворачы мясцовым людзям, спакаваў свае рэчы на воз і выехаў у Цехановец, дзе жылі яго сваякі. Калі ў 1939 годзе ўвайшла Чырвоная Армія і на Бугу ўсталявалася граніца, многія людзі ноччу пераходзілі яе на нямецкі бок. Многія падаваліся ў Варшаву, у іх ліку і Шульцы.

Сын Пятра Шульца, Ежы, пазнейшы прафесар хірургіі, а тады афіцэр у званні паручніка, пасля яшчэ за нечым тайком вярнуўся ў Паўлінова. Бадай прыходзіў па закапаныя бацькам каштоўнасці і нешта з сабою забраў. Што гэта было, невядома, але відаць важнае, калі дзеля гэтага рызыкаваў жыццём. Ежы Шульц працаваў у Варшаве, памёр у 1996 годзе. Пахавалі яго ў Паўлінове сярод сямейных магіл побач родавай каплічкі. На яго магіле стаіць скромны бярозавы праваслаўны крыж.

Ежы Шульц меў дзве дачкі: Анну — музыку і Багумілу — біёлага. Калісь спадар Талочка размаўляў з імі. Гаварылі, што ў будучыні хочуць упарадкаваць запушчаныя магілы, каб калісь, як прыйдзе пара, спачыць сярод сям'і.

У Паўлінове па Шульцах асталіся не толькі магілы. Стаіць яшчэ звыш стогадовая хата, захаваліся яшчэ фрагменты парку. На двух старых дубах вісяць таблічкі рэстаўратара прыроды. Да 60-х гадоў стаяў тут яшчэ будынак, які ў Паўлінове называлі „палацам", але яго разабралі; асталіся толькі рэшткі бетонных сходкаў. Спадар Талочка даглядае тое, што асталося, бо ў хатку здараюцца ўзломы. У яго доўг удзячнасці Ежы Шульцу і ягонай сям'і. Калісь, калі захварэла жонка спадара Талочкі, прафесар не адмовіў дапамогі і скіраваў на лячэнне да бельскіх хірургаў, якія былі яго вучнямі.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

У. Талочка перад домам Шульцаў

У 70-я гады Ежы Шульц хацеў прынесці сваёй бацькаўшчыне добры ўчынак. Ён апрацаваў праект ландшафтнага парку ў даліне ракі Нурэц у наваколлі Паўлінова. Са сваімі планамі выбіваў парогі да беластоцкіх улад, але нічога там не дабіўся; гэтак жа і ўлады Арлянскай гміны паставіліся да прафесаравага праекта абыякава. Сёння, калі лугі на Нурцы каля Паўлінова запускаюцца, варта можа вярнуцца да ідэі Ежы Шульца. Ён, народжаны тут, напэўна ведаў, што можа быць добрае арлянскай зямлі і пражываючым тут людзям. Але гмінныя ўлады пра гэта не клапоцяцца і на тэрыторыі Арлянскай гміны няма ахоўваемых прыродных абшараў.

Факт, што Арлянская гміна распаложана ў межах функцыянальнага абшару Зялёных лёгкіх Польшчы паміж ключавымі зонамі міжнароднага значэння: Далінай Верхняй Нарвы, Далінай Ніжняга Буга і Белавежскай пушчай. Гэтыя абшары дапоўнены экалагічнымі калідорамі дзяржаўнага значэння, адным з якіх з'яўляецца даліна ракі Нурэц, якая ахоплівае паўднёвую частку Арлянскай гміны ў наваколлі вёсак Паўлінова, Чахі-Забалотныя і Вулька-Выгаеўская. Таксама даліны Арлянкі і Белай з'яўляюцца важнымі экалагічнымі калідорамі.

Міхал Мінцэвіч

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У школьным этапе конкурсу прынялі ўдзел вучні першых, другіх і трэціх класаў (побач настаўнік Ян Карчэўскі)

Больш удзельнікаў

У школьным этапе II Конкурсу беларускай мовы для гімназістаў, які адбыўся 6 снежня, прынялі ўдзел 26 вучняў з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы.

Белгімназісты выконвалі практыкаванні па граматыцы беларускай мовы і адказвалі на пытанні па разуменні прачытанага публіцыстычнага тэксту. Школьная камісія, якую сабралі настаўнікі беларускай мовы Ян Карчэўскі, Вольга Сянкевіч і Іаланта Грыгарук, звяртала вялікую ўвагу на арфаграфію і марфалогію. Добра атрымаліся ў вучняў адказы на пытанні па тэксце. Найбольш памылак зрабілі гімназісты ў напісанні лічэбнікаў. Вучням першых і другіх класаў трэба было самастойна рыхтавацца да некаторых граматычных практыкаванняў, якімі займаюцца ў белгімназіі ў трэцім класе.

— Цешыць нас, што намнога больш вучняў прыняло ўдзел у школьным этапе конкурсу, чым год назад (11 асоб), — заявіў старшыня школьнай камісіі Ян Карчэўскі.

Аляксей Мароз

Вачыма паляка

Надзея ў культуры

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўсё знянацку здзіўляе. У апошні час навёў паніку на польскія памежныя і дыпламатычныя службы. Беларускі правадыр прадказаў, што мяжа з Польшчай будзе менш шчыльная. Ягоная адміністрацыя адназначна дала зразумець, што ў Польшчу разнамасныя турысты і эмігранты змогуць дабрацца без большых праблем з боку беларускіх памежных служб. Гэта адчыталі ў Польшчы таксама як дазвол на не цалкам легальнае падарожжа ў Польшчу і далей на еўрапейскі Захад, м.інш. чачэнцаў і азіятаў. Польскі міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч на радыёхвалях такую ідэю прэзідэнта Лукашэнкі назваў авантурысцкай палітыкай. Але няма таго кепскага, якое ў добрае б не абярнулася. У час еўрасаюзных перагавораў у Капенгагене Польшча здабыла дадатковыя мільёны еўра на ўшчыльненне ўсходняй мяжы. Не выключана, што на такое рашэнне краін „пятнаццаткі" мела якраз „памежная" палітыка прэзідэнта Беларусі.

Нягледзячы на палітыку, якая пойдзе ў след за тымі і іншымі прадказаннямі Лукашэнкі, мы, палякі, асабліва пражываючыя на Усходняй сцяне, мусім жыць у добрасуседскім клімаце з беларусамі. Нават прыплюшчваючы вока на некаторыя паводзіны суседняга правадыра (хоць абсалютна не на ўсе, асабліва на тыя, звязаныя з парушэннямі правоў чалавека і грамадзянскіх свабод у Беларусі).

Добрасуседскі клімат — гэта акрэсленне вельмі прыгожае, ды, думаю, ні мясцовыя адміністрацыйныя і самаўрадавыя ўлады, ні цэнтральныя, не вельмі ведаюць, як перакласці іх на практычныя дзеянні. Па-за шырока разуметым культурным абменам (маю адвагу сцвердзіць, што найбольш простай, але найбольш „апорнай" формай супрацоўніцтва) няшмат больш можна зрабіць. Добра разумеюць падляшскі ваявода Марэк Сташалінскі і маршалак ваяводства Януш Кшыжэўскі, што найбольш эфектыўнае супрацоўніцтва — эканамічнае, асабліва малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Што ж, аднак, з таго, калі беларускія законы і структура гаспадаркі ніяк не прыстаюць да сённяшніх польскіх, а ў недалёкай будучыні польска-еўрасаюзных. Беларусь застаецца адзінай у Еўропе краінай, у якой аж 85% актываў — дзяржаўная ўласнасць. Больш таго, беларуская эканоміка арыентуецца на Расію, а Польшча — на еўрапейскі рынак. У гандлі з Польшчай беларускі экспарт трымаецца на ўзроўні 3,7%, імпарт — 2,5%. Беларусы найбольш ахвотна экспартуюць і імпартуюць машыны, абсталяванне і транспартныя сродкі, мінеральныя і хімічныя прадукты, гуму. І таму чвэрць польскага экспарту ў Беларусь гэта машыны і прамысловае абсталяванне (збожжавыя камбайны, запасныя часткі для машын, стружкавыя пліты, мэбля, кінескопы і інш.). Беручы, аднак, пад увагу становішча падляшскіх і, шырэй, польскіх фірм і ўбоства беларускай гаспадаркі (м.інш. пастаянны недахоп валюты), перспектывы „добрасуседскіх кантактаў", дзеля актывізавання эканамічнага супрацоўніцтва паміж Польшчай (перш за ўсё Падляшшам) і Беларуссю (паасобнымі абласцямі, для прыкладу, Гродзенскай) у перспектыве бліжэйшых гадоў — ніякае. Не памагае ў тым, вядома, тое, што Польшча прэцца ў Еўрасаюз, а Беларусь — у Расію.

Ну, дык як жыць побач сябе? Застаецца, вось, гэты культурны абмен. Спазіраючы, аднак, на выдадзены Маршалкоўскай управай Каляндар культурных мерапрыемстваў Падляшскага ваяводства на 2003 год, будзе ён зноў нікчэмным адсоткам усіх культурных ініцыятыў у нашым рэгіёне. На жаль. Але шмат будзе залежаць яшчэ ад ваяводскае ўправы, а асабліва ад актыўнасці ейнага члена Яна Сычэўскага, старшыні Беларускага грамадска-культурнага таварыства.

Мацей Халадоўскі

БСФ распачаў дзейнасць

У час Агульнага сходу заснавальнікаў Беларускага самаўрадавага форуму, які адбыўся 15 снежня 2002 года ў памяшканні Гайнаўскага аддзела Беларускага саюза, былі выбраны ўлады і абмеркаваны план дзейнасці арганізацыі. Старшынёй управы стаў Міхась Андрасюк з Гайнаўкі, яго намеснікамі Яўген Вапа з Беластока і Андрэй Сцепанюк з Бельска-Падляшскага. Сакратаром выбраны быў Яўген Сачко, а скарбнікам — Міхал Голуб.

У заснавальніцкім сходзе форуму, які праходзіў 2 снежня 2001 года, прынялі ўдзел самаўрадаўцы і дзеячы вядомыя ў беларускім асяроддзі Гайнаўшчыны, Бельшчыны і Беласточчыны. 25 красавіка 2002 года быў ён зарэгістраваны ў судзе. Статут форуму прадбачвае выбар яго ўлад з ліку заснавальнікаў. Зараз новыя ўлады змогуць прымаць новых членаў, якія не мусяць быць раднымі.

— Самаўрадавыя выбары адбываюцца раз на чатыры гады і тады актывізуецца беларускае асяроддзе. У форуме дзейнічаюць беларускія самаўрадаўцы і людзі, зацікаўленыя грамадскай дзейнасцю. Плануем наладзіць супрацоўніцтва паміж Гайнаўшчынай, Бельшчынай і Беласточчынай, — заявіў старшыня форуму Міхась Андрасюк. — Пасля выбараў многімі раднымі ад беларускіх камітэтаў сталі новыя асобы, якія выявілі ахвоту супрацоўнічаць у рамках нашых гмін. Мы не хочам забываць пра кандыдатаў на самаўрадаўцаў, якія не сталі раднымі. Частка з гэтых людзей хоча працаваць для беларускага асяроддзя.

Беларускі самаўрадавы форум намерваецца садзейнічаць гаспадарчаму развіццю гмін Беласточчыны і абмену вопытам паміж самаўрадаўцамі. Яго члены маюць намер актывізаваць развіццё беларускай культуры і асветы. Карыстаючыся асабістымі кантактамі і супрацоўніцтвам паміж раднымі паасобных гмін, форум змагаецца са стэрэатыпам, што беларускае з'яўляецца ворагам польскага. Будуць ладзіцца семінары з удзелам прадстаўнікоў польскага асяроддзя і нацыянальных меншасцей. Улады форуму будуць арганізаваць спатканні з прадпрымальнікамі і людзьмі культуры, дабівацца правоў належных жыхарам Беласточчыны, а таксама займацца аховай асяроддзя. Сродкі на сваю дзейнасць плануюць атрымліваць ад няўрадавых арганізацый, прыватных спонсараў і дзяржаўных устаноў.

— Хочам, каб наш голас у справе рэгіёнаў, дзе кампактна жывуць беларусы, заўважальны быў у ваяводстве. Адна з мэт нашай дзейнасці — удзел у самаўрадавых выбарах, да якіх трэба рыхтавацца намнога раней, чым рабілі мы да гэтага часу. Форум павінен каардынаваць удзел беларускіх кандыдатаў у выбарах на Гайнаўшчыне, Бельшчыне і Беласточчыне. Мы павінны таксама выпрацаваць супольную прапанову, як прыступіць да парламенцкіх выбараў — самастойна ці ў кааліцыі? — сказаў Міхась Андрасюк. — Калі нехта скажа, што стварылі мы яшчэ адну арганізацыю, то я б сказаў, што ў нас мала арганізацый. У нармальных умовах павінны ўзнікаць таварыствы вудзільшчыкаў, філатэлістаў і іншыя.

Аляксей Мароз

Вялікае княства Літоўскае і Беларусь пасля Люблінскай уніі

Канферэнцыя пад такім загалоўкам, арганізаваная Беларускім гістарычным таварыствам і Кафедрай беларускай культуры Універсітэта ў Беластоку, прайшла пры канцы мінулага года ў Супраслі. Гісторыкі з Беластока, Торуні, Гродна, Мінска, Віцебска і Магілёва разважалі пра ўнутраныя праблемы літоўска-беларускай дзяржавы, а таксама яе адносіны з Каралеўствам Польскім і Масквой.

Найбольш наватарскія даклады прадставілі Максім Макраў з Віцебска, Тамаш Кэмпа з Торуні і Мажэна Лідкэ з Беластока. Макраў, разважаючы пра юрыдычнае становішча мяшчан Суража і Улы, што ў Віцебскім ваяводстве, даказваў, што прывілеі ў выглядзе вайсковых правоў, нададзеныя мяшчанству, будавалі абарончую сістэму дзяржавы больш паспяхова, чым шляхецкая армія.

Тамаш Кэмпа прадставіў закуліссе выбараў караля Рэчы Паспалітай пасля смерці Зыгмунта Аўгуста. Паводле дакладчыка, магнаты Вялікага княства Літоўскага, а асабліва Радзівілы, імкнуліся абраць караля, які вярнуў бы Літве інкарпараваныя Польшчай землі ў 1569 г. — Падляшша, Валынь, Кіеўшчыну, Падолле. Іх кандыдатам стаў Эрнст Габсбург. Літоўскія магнаты не атрымалі аднак падтрымкі для гэтай ідэі з боку ні валынскай, ні кіеўскай рускай шляхты і магнатаў. Гэтыя апошнія зацікаўленыя былі быць грамадзянамі Каралеўства Польскага.

Мажэна Лідкэ паказала як рэфармацыя паспрыяла паланізацыі праваслаўнай шляхты. Калі з'явілася мода на пратэстантызм, кальвінамі ў Вялікім княстве Літоўскім станавіліся так каталіцкія, як і праваслаўныя магнаты. За імі ішла шляхта. Але разам з контррэфармацыяй, пры канцы XVI стагоддзя, пратэстанты станавіліся каталікамі. Былыя каталіцкія роды толькі вярталіся да свайго ранейшага веравызнання, былыя праваслаўныя, з мэтай аблягчэння сабе кар'еры, таксама прымалі каталіцкае веравызнанне. Пратэстантызм у Беларусі развіваўся на аснове польскай мовы. Была яна прысутнай у літургічным жыцці і літаратуры, пры дапамозе якой пратэстанты прапагандавалі свае ідэі. Праваслаўных называлі русінамі, пратэстантаў не ўлічвалі да кола гэтай культуры. Былі яны людзьмі лацінскай культуры.

Вялікае зацікаўленне, асабліва сярод мужчынскай часткі ўдзельнікаў канферэнцыі, выклікаў даклад Наталлі Гардзіенкі пра вобраз жанчын у мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя. Ідэальная жанчына была вельмі нуднай — набожнай, кахаючай толькі свайго мужа, нараджаючай шмат дзяцей. Пажаданае было, каб жанчына, перш за ўсё, была прыгожай, разумнай — неабавязкова. Гэта дакладна як цяпер, каменціравалі ціха мужчынскія шавіністы. (ям)

Літаратурна-мастацкая старонка № 513

Міра Лукша

Вышыванае сэрца

У той снежны вечар пад Заблудавам разбілася шэсць машын. У аварыю сябры не трапілі таму, што не маглі нагуляцца ў „Белай ружы" і пад Рыбакамі былі каля трэцяй ночы.

Ужо ў рэстаране Марынка мела візію. Паколькі не піла гарэлкі, гэта было б дзіва. Глашка не здзівілася ані — паглядзела ў бліскучыя ад узбуджання вочы Марынкі, якая тлумачыла Грышу вобраз, які выплыў перад яе вачыма: вялікае вышыванае сэрца, павешанае над расчыненымі дзвярыма, а ў яго ўваткнёныя дзіды. „Не, не дзіды! — зусім не здзівіўся Грышка. — Над маімі дзвярыма вісіць вялікае вышыванае сэрца-падушачка, ды не дзіды ў яго паўбіваныя, а, звычайна, іголкі. Мама-нябожчыца вышывала, яна і тыя іголкі ды пруткі паўколвала. Чапаць не трэба — маміна праца ды старанне, мамы яшчэ маладое, як жыла ў Рыбаках". Грышка вярнуўся жыць у бабуліну хату, скуль мама маладой была выйшла. Так жыццё склалася. І, так як было, так і ёсць. Адно камп'ютэр паставіў. І адзін жыве, з чатырма катамі. Сам адзін. Бо і жонка яго пакінула. Таксама Богу спатрэбілася. Ды ў Грышкавых аповесцях яны ўсе жывыя. І ён шчаслівы ў гэтых Рыбаках, хоць сам адзін з тымі катамі.

— І тыя голкі трэба дастаць, як з твайго сэрца, Грышка, — не адставала Марынка, і, хоць найцверазейшая не то што ў гэтай кампаніі, але і ўва ўсёй Гайнаўцы ў той вечар, вочы ў яе свяціліся як ад гарадоцкае гарэліцы, што пры месяцы яе выганяюць.

Калі вылезлі з Вацікавага „Фіата", проста ў глыбокі скрыпучы снег, у гранатавую цемру, паказаўся срэбны крыж. На заходнім небе. Першы на калені бухнуў Бода. „Знак! Кепскі знак! — выдыхнуў клубамі пары ўвесь ляк, які ў ім таіўся. — Маме наснілася нядобрых сноў!"

Грышка адчыніў скрыпучыя на марозе дзверы бабінай хаты. З сенцаў выйшлі чатыры каты і маўкліва пацерліся аб ягоныя ногі. Пайшлі ў спальню. Бода дастаў бутэльку, Глашка чатыры яблыкі. Паселі на зялёную, пакрытую штучнай скурай канапу. З аблупленых сцен спазіралі сепіевыя здымкі Грышкавых продкаў, якія ад стагоддзяў пражывалі над Нарвай.

У сцяноўцы гудзеў вецер — хата выстудзілася, пэўна, ад таго, што Грышка, як прапальвае ў печы, не засоўвае коміна. Спрабавала Марынка падкласці агонь пад абы-як зваленыя ў грубку макраватыя паленцы. Давялося лінуць гарэлкі, каб ніхто не бачыў. „Удалося? Так хутка? — здзівіўся Грышка. — Я распальваю дзве гадзіны".

Адагнулася Марынка ад дзверцаў, глянула на дзверы.



Мал. КАЦЯРЫНЫ ВАЛКАВЫЦКАЙ

Над праёмам вісела запыленае вялікае вышыванае ў макі сэрца, а побач — звычайная іголкавая падушачка. У той падушачцы не было, аднак, іголак, затое з сэрца прамяніста тырчэлі іголкі тонкія, іголкі-грашоўкі, пруткі і паржавелыя, пагнёныя ў маланкі драты. Падсунула Марынка крэсла пад дзверы, стала на дыбкі і адубелымі пальцамі пачала вывалакаць з сэрца ўсё жалезіва. Перакалола ўсё тое ў другую падушачку.

Са спальні ляцеў настуджаны голас Глашкі, адбіваўся рэхам па пустых пакоях:

— Бода, не бойся таго крыжа на небе. Бо ён — чыста каталіцкі. А ты ж — памешаны. Калі б на тваю, не дай Бог, згубу, дык яшчэ адна перакладзіна на небе віднела б!

Марынка прычыніла дзверцы. Загудзеў агонь.

Тоўстыя каты паселі пад печкай, заўзіраліся на Грышкавых сяброў. Яны сёння елі „Віскас". Яны, Грышкавы каты.

На канапе радочкам румяніліся Глашка, Вацік, Бода і сам Грышка, праціраючы ўспацелыя ад хвалявання і цяпла акуляры.

Срэбны крыж усё святлеў на захадзе, аж расплыўся паміж зорамі.

Набліжаліся Каляды.

Паўліна Шафран

Верка

Верка прыйшла на свет як шостае дзіця Івана Данілавага, п'яніцы, які справядлівасці шукаў рукамі. Не шануючы жонкі, дзяцей ні суседзяў, Іван жыў бязбожна, за цара і памочніка прызнаваў бутэльку.

Дзяўчынка, так як і яе браты, добра спазнала горкі смак жыцця. Бітая бацькам, уцякала да старой Гандзі, вясковай шаптухі, якая патрапіла не толькі замовіць, каб карова малако давала, але і з картаў прадказаць будучыню. Але тая ніколі не хацела паваражыць Верцы.

— Не, дзіцятка, — гаварыла, ківаючы галавой, — лепш ідзі ў царкву, памаліся, папрасі ў Бога шчасця, а не ў старой шаптухі. Што табе наканавана, так і будзе.

Бацька піў, біў, а маці, як то жанчына, ахоўвала сямейны ачаг. „Ша, ша, ціха, не гавары нічога, няхай людзі не ведаюць", — прасіла са слязамі ў вачах. І Верка схіляла галаву, плакала і заракалася: „Я так жыць не буду! Ніхто на мяне рукі не падыме, не ўдарыць!"

Міналі гады. Дзяўчына за працай не мела часу на забаву. Ат, часам на вячоркі забіралі яе суседкі, і то, стоячы перад брамкай на дарозе, каб п'яны Іван не згледзеў.

Верка скончыла 18 гадоў. „Замуж яе аддаць трэба! На што дармаеда ў хаце трымаць?! Або замуж няхай ідзе, або да работы ў кагось наймаецца!" —часта можна было пачуць у Данілавай хаце.

Дык калі прыйшлі сваты, ад удаўца, Рыгора Касінскага, Верка адразу дала згоду.

„Ратунак мой, ратунак! — думала, кладучыся спаць. — Што з таго, што ён старэйшы за мяне на пятнаццаць гадоў?! Пазнаў жыццё, жонку меў, ведае ролю жанчыны ў хаце! А работы на гектарах не баюся. Будзе добра!"

Нават бацька радаваўся, што багаты і добры зяць будзе. Маці і браты ганарыліся перад суседзямі: „От бачыце, наша Верка такая худзінка была, а цяпер?! О, хто яе захацеў! Сам Рыгор з Махайлава! Добра дзяўчына трапіла! Толькі пазавідаваць!"

А людзі, як людзі. Часам хтось пад носам буркнуў, што ад Гандзі-шаптухі якоесь зелле ўзяла і чары кінула, каб такога кандыдата найсці. Пазайздросцілі ледзь не ўсе.

Толькі старая Гандзя асцерагала Верку.

— Падумай, дзіцятка, — гаварыла сваім хрыплым голасам, прыжмурваючы вочы. — Не ідзі за яго! Падумай яшчэ! Маладая ты, жыццё перад табою.

— Якое? З бацькам-п'яніцам, які толькі біць умее?

Да вяселля астаўся тыдзень. Сукенка ляжала ў сундучку разам з радзюжкамі і пасцеллю. Усё ішло як трэба.

Вечарам у аўторак Верка выбралася да Гандзі. Застала жанчыну пахіленую над картамі.

— Што, цёця, сабе разлажылі? А, можа, і мне перад вяселлем паварожыце? — спытала жартам.

— Добра, — сядай, — сказала Гандзя.

Верцы ад здзіўлення перабеглі па целе дрыжыкі. „Не рабі гэтага, — шыпела ў галаве, — лепш не ведаць..." Аднак села.

Гандзя ўздыхнула цяжка і стала чытаць Верчын лёс. Тое, што сказала, калыхнула Верку. Яна хутка паднялася ад стала і загаласіла:

— Як можаш такое мне гаварыць?! Сама ты ніколі не спазнала шчасця і камусь шкадуеш?! А я цябе цёцяй называла! Божа, ты мне за маму была! А цяпер — што? Крыўды і няшчасця майго хочаш? — І са слязамі выбегла з хаты.

А старая Гандзя сядзела за сталом і спакойна складвала карты.

— Не, дзіцятка, гэта не так, — уздыхнула з горыччу і глянула на ікону ў рагу кухні. — Маці Божая, памагай ёй, сцеражы...

І вось надышоў дзень вяселля. Сышліся госці, прыехаў Рыгор са сваімі. Пачаткова ўсё ішло належным чынам. Нават надвор'е радавалася і бацька быў яшчэ цвярозы.

А ў царкве здарылася непрыемнасць. Калі маладыя падыходзілі да бацюшкі, дарогу перайшла ім старэйшая сястра былой жонкі Рыгора. Гэтага нельга было рабіць! У Веркі задрыжалі рукі. „То, пэўна, Гандзя намовіла Ірку так зрабіць, каб збыліся яе словы" — падумала маладая.

Калі госці пілі і елі, нехта крыкнуў на двары. Верка выйшла. На парозе ляжала мёртвая чорная варона.

— Ой! То нядобра. Штось дрэннае з вамі станецца, — сказала суседка. — Якіясь у вас чары!

— Дурным словам не давярайце, — закрычаў Рыгор. — Налівайце, частуйцеся, гуляйце! Гэта маё вяселле! Гуляць трэба!

І гулялі, і елі, і пілі...

Пасля вяселля споўніліся словы Гандзі. Рыгор аказаўся горшым за бацьку. Патрапіў так ударыць, што дых адымала.

Не было і каму пажаліцца. Мама паўтарала сваё: „Ша, ша, ціха, хай людзі не знаюць", а бацька смяяўся : „От і разумны мужчына, добра знае, што з бабамі рабіць!"

Рыгор біў і піў штораз больш. Не зважаў нават на тое, што Верка пад сэрцам насіла ягонае дзіця. А работы на гаспадарцы прыбывала. І свіням бульбы трэба было насекчы, кароў падаіць і бітоны з малаком перанесці да калодзежа і ў сярэдзіну ўставіць.

Усё рабіла сама. Часам ногі не трымалі. Тады сцірала адной рукой пот з ілба, а другой пяшчотна абымала жывот і гладзіла далікатна. „Чакаю цябе, мая крушынка, чакаю, сонейка", — шаптала.

Вечарамі, калі п'яны да непрытомнасці Рыгор валіўся на ложак, яна канстатавала з горыччу: „От і шчасце я сабе знайшла. Мацер Божая, памажы хоць майму дзіцяці!"

Малітвы не памаглі...

Вярнуўшыся ад суседа, п'яны Рыгор застаў Верку каля хлява. Невядома чаму сцягнуў з яе яе хустку, схапіў за валасы і, набліжыўшыся да яе твару, прасіпеў:

— Знаеш, што людзі гавораць? Ты не маё дзіця носіш, а якогась парабка! Так?! Захацелася табе шчасця? То маеш! — і стаў біць яе па галаве, а калі, ашаломленая, ўпала на зямлю, закрываючы рукамі жывот, пачаў яе таптаць...

Верка не памятала, як давалаклася да Гандзінай хаты. У галаве была толькі адна думка: „Ратаваць дзіця, ратаваць дзіця!...Толькі чаму рукі і ногі ў крыві? А спадніца....? Да Гандзі, хутчэй да Гандзі!"

Шаптуха не змагла памагчы.

Праз некалькі гадзін трымала на руках мёртвую дзяўчынку.

— Жыве? — прачнуўшыся, спытала Верка.

Гандзя пакруціла галавой. Верка адвярнула вочы да сцяны і сказала:

— Можа то і лепш... Якое было б у яе жыццё?!

— Не грашы, дурная, — сказала востра Гандзя. — Усё яшчэ будзе добра і ў цябе!

Верка горка засмяялася...

Вечарам, сабраўшыся з сіламі, загарнула мёртвае дзіця ў хустку:

— Іду да сябе. Пахаваць трэба...

На другі дзень, пасля абеду, нехта пастукаў у акно.

— Гандзю! Верка ўтапілася, забіла сябе і дзіця! Чуеш?!

А Гандзя ўжо нічога не чула. Старое сэрца пачало хутка біцца, а горкія слёзы сталі пячы....

— Божа, Божа... за што? Такая маладая была, ой Божа, Божа....

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Выдатнікі па беларускай мове ў I „б"; першая справа — Наталля Дзмітрук

На Каляды ў бабулінай хаце

Наталька Дзмітрук з I „б" класа гімназіі ў бельскай „тройцы" цікавіцца архітэктурай Падляшша. У вёсцы сваіх бацькоў, у Москаўцах, прыкмеціла, што забудовы там іншыя як у наваколлі. Гаспадарчыя будынкі ставяць на высокім беразе вуліцы, хаты ўнізе.

— Калі ішла паводка, яна займала найперш жылыя памяшканні. Людзям прасцей было перайсці на сухое месца, а стадолы і жывіна былі забяспечаны, — кажа Наталля. Практычны бок архітэктуры вынікаў з небагатай гаспадаркі. Цяпер людзі дбаюць не адно пра выгоду, яны ўпрыгожваюць панадворкі, хаты.

Наталька падарожнічала па краінах Еўропы і ўмее дацаніць асаблівасць падляшскай архітэктуры.

— Мяне ўражвае, — кажа гімназістка, — што ў нас умеюць прыдбаць цёплую атмасферу хатам. Асабліва прыгожа ў вясковых бабуль. Там калярова і вельмі „цёпла". Людзі, калі толькі зойдзеш, частуюць гарбатай і добрым словам. Усе цікавяцца табой — пытаюць пра сям'ю, родных і нават пра ацэнкі ў школе. Наталька Дзмітрук да нядаўна марыла стаць архітэктарам — цяпер сумняваецца — вабіць яе прафесія дантысткі. Ну, але на тое, каб выбраць дарогу ў жыцці, ёсць яшчэ час.

Усе аднакласнікі Наталлі любяць чытаць „Зорку". Ім спадабаліся допісы аднагодкаў са школы ў Нараўцы, якія пішуць пра свае вёскі.

У час Калядных Свят любім вярта́цца ў вёску — да родных і старадаўніх традыцый.

ЗОРКА

Польска-беларуская крыжаванка № 1



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 49: Прыпас, цяга, сыр, след, снежань, клетка, рог, арка, поваб, пыласос. Стол, плыт, кроп, словы, снег, сцежка, яда, ар, накос, даль.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Данель Сельвяструк** з Гародчына, **Паўліна Мароз** з Новага Корніна, **Аня Пашко**, **Эвеліна Прабуцкая**, **Эвеліна Келбашэўская** з Нарвы, **Беата Аксютыч**, **Пётр Галёнка** з Арэшкава, **Аня Артэмюк** з Парцава, **Павал Хлябіч** з Гарадка. Віншуем!

Вершы Віктара Шведа

Перад Калядамі

На кухні маці рыхтуе
Вячэру ўжо калядную.
З пакоя крычыць Міколка:
— Мама, гарыць наша ёлка!

— Май жа, сынок, на прыкмеце,
Што не гарыць, толькі свеціць.
Прыбег сыночак маланкай:
— Свеціцца наша фіранка!

Святочны заказ

— Матуля мая дарагая,
З пісьма да Святога Мікалая
Выкраслі гэты цягнік,
І ровар вазьмі ва ўлік.

— Чаму ж ты, мілы сыночак,
Ужо цягніка не хочаш?
— Знайшоў я — шукаць мая звычка —
У шафе цягнік-электрычку.

Як рыцар Точак выратаваў Брыгіду

У 1134 годзе ўспыхнула руска-татарская вайна. Армія Каліяр'ева рушыла на поўдзень разведаць заваяваную правінцыю.

— Татары — гэта страхапуты! — сказаў адзін русін.

— Пэўна, — усміхнуўся крывадушна Каліяр'еў, — ніхто нам тут не падскочыць!

* * *

Тым часам татары вярталіся з прайгранай вайны. У арміі татараў было адно дзіця, адзінаццацігадовая Брыгіда. Яна не была ні таткай, ні русінкай. Ніхто не ведаў яе паходжання ні нацыянальнасці. Не паясніў гэтага нядаўна праведзены агульнаплемянны перапіс насельніцтва.

— На днях я памру! — абвясціў хан.

— І што тады будзе? — сказала сумна Брыгіда. — Яны, гэта значыць, твае дружыннікі, заб'юць мяне.

— Не бойся малая, мой брат Мінхен будзе валадарыць пасля мяне, — сказаў хан.

* * *

На другі дзень, раніцай, Брыгіда прачнулася ў сем гадзін і зірнула на ложак пад балдахінам. На жаль, не пабачыла там свайго старога караля. На ложку ляжаў нейкі тоўсты, асавелы дзядзька. З чорнымі вусамі і лысай галавой, без аднаго вуха, а з яго рота тырчэў адзін зуб.

— Пайшла спаць! — загадаў ён Брыгідзе. Дзяўчынка прылегла і праз хвіліну заснула. У дзевяць раніцы Брыгіда яшчэ раз зірнула на новага караля-хана.

— Які дзівосны тып чалавека! — падумала яна.

— Ідзі, дзіця, адсюль, не глядзі на яго, гэта неандэрталец з пруска-руска-яцвяжскага роду, — сказаў намеснік хана.

— Якія ў вас парадкі?! — абурылася Брыгіда. — Ён жа ж русін, наш вораг, ён прадасць ім нашы сакрэты. [☞ 7]

Гісторыя маёй мясцовасці

Дубічы-Царкоўныя

Дубічы-Царкоўныя гэта сядзіба Гміннай управы. Назву сваю выводзяць ад асабовай назвы „Дуб". Даданая частка „Царкоўныя", сведчыць аб тым, што ў вёсцы знаходзіцца царква. Вёска Дубічы-Царкоўныя паўстала каля 1532 года. На гэтую тэму існуе многа легенд. Адна з іх гаворыць, што ад самага пачатку існавання вёскі была тут царква. Гэта пацвярджае прывілея, якую надаў князь Зыгмунт II у 1553 г. Першая царква знаходзілася на пагорку каля ўрочышча Бахматы (сёння Асяродак спорту і адпачынку). Як гаворыць легенда, царква пад названнем святых Пятра і Паўла згарэла. У час пажару гэтай святыні ікона, якую нёс вецер, упала ў канцы вёскі, з боку Грабаўца. На гэтым месцы была пабудавана царква пад названнем Апекі Божай Маці.

Другая легенда гаворыць, што першая царква не згарэла, але з-за грахоў парафіян правалілася скрозь зямлю. У дзень святых Пятра і Паўла, які адзначаецца 12 ліпеня, можна пайсці ў поўдзень на гэты пагорак, прыкласці вуха да зямлі, і пачуць царкоўныя званы. На месцы старой царквы стаіць сёння крыж з датай 1902 г. Гэта памятка па першай царкве.

У Дубічах гавораць таксама аб скарбе Напалеона, які праўдападобна знаходзіцца непадалёк ад вёскі. Скарб схавалі французы, уцякаючы з Расіі ў 1812 г. У час I сусветнай вайны многія жыхары пад прымусам расійскіх улад выехалі ў глыб Расіі. У час II сусветнай вайны вёска была цалкам знішчана. У першыя гады пасля вайны ў вёсцы паўстала школа, магазін, пажарная каманда, гмінная ўстанова, пошта, паліцэйскі пост. У пазнейшыя гады паўстаў асяродак здароўя і банк. У 1985 г. дзве вуліцы атрымалі свае назвы: Чырвонай Арміі (сёння Паркавая) і 40-годдзя ПНР (сёння Галоўная). Цяпер у Дубічах чатыры вуліцы: Паркавая, Галоўная, Асядлёвая і Лясная. У 1987 г. на рацэ Арлянцы паўстала вадасховішча. Летась пры Пачатковай школе пачала весці сваю дзейнасць турыстычная база.

Самы стары дом у Дубічах з нумарам 34. Пабудаваны ён у другой палове XIX ст. Гэтая хата пакрытая саломай. Да гэтай пары ўтрымалася столь, на якой сляды ад снарадаў. У вёсцы знаходзіцца таксама пагранзастава і ферма страусаў.

Дубічы-Царкоўныя гэта прыгожая і самая вялікая вёска на Падляшшы.

Моніка Старасельнік,
I „ц" кл. белліцэя ў Гайнаўцы

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дзеці з Беластока гуляюць у лялечны тэатр

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Танцоркі з Рыбалаў

Звяркі

Кожны хоча мець свайго звяра. Файна мець вялікага каня, на якім паедзеш вярхом. Ды для такога вялікага звяра патрэбна стайня, і многа ежы. І часаць яго трэба, чысціць... І многа прасторы трэба, каб адчуваў сябе добра. Ды дзе ж будзеш трымаць каня, калі сам жывеш, напрыклад, у блёку? Сам не маеш дзе выгульвацца — перад домам скверык з пару дрэўцамі, пажухлая, стаптаная траўка... Каб выбрацца за горад, дык гэта ўжо як на вандроўку збіраешся. А на тым скверыку не толькі конь, а нават і хатнія сабачкі ці коцікі не адчуваюць сябе, здаецца, найлепш.

Гэта яшчэ добра, калі бацькі дазволяць трымаць сабаку ці ката. З імі пагуляць, нават паразмаўляць можна. Праўда, не ўмеюць яны гаварыць, але разумеюць усё. Толькі што клопат з імі — выгульваць трэба, нават вельмі рана, калі ледзь толькі горад устае, выводзіць за патрэбай. І прыбіраць за імі. А каму хочацца займацца гэтым, калі паспаць яшчэ можна... І ўвечары аб іх не забываць, і летам забіраць на канікулы, а не ўсюды пускаюць з жывёлай. Клопат. Нават калі ў цябе малая чарапашка, з якою ніяк не дамовішся і не пабегаеш па падворку — і за ёю трэба даглядаць.

А калі табе тата з мамай не дазволілі мець нават маленькага трусіка, нават марскую свінку ці хамячка... Можа, не любяць звяроў, лішняга клопату, або ў цябе алергія на жывёльную шэрсць? Вось так здарылася і з Паўлікам. Яму нельга дакранацца ні да ката, ні да сабакі, ні да труса. Кране нават адну валасінку, якую пакінуў нейкі звер — і пачынае душыцца: пухне яму горла, свярбіць скура, пякуць вочы... Гэта мала, што відаць — унутры арганізма адбываецца яшчэ больш складанае і страшнае. І лякарствы мала памагаюць. Бедны Паўлік таксама кепска рэагуе на расліны і іх пылок. А што з ім робіцца, калі таполі сыплюць белы пух! На вуліцу нават не выйдзе! Бяда!

І не то што няма ў Паўліка звярка дома. Няма ў яго ні браціка ні сястрычкі, і сябры — толькі калегі ў школе. А з імі таксама не пагуляе — усе яны здаровыя. Пабягуць — на задыханага Паўліка і не азірнуцца!..

Чытае Паўлік кнігі пра самых аграмадных звяроў, якіх ужо няма: пра дыназаўраў. Не справіліся з прыродай. Не далі рады жыць. Змяніўся клімат, тлумачыць Паўлік бабулі і паказвае ёй намаляваных у кнізе каляровых дыназаўраў. А бабуля не верыць: не забраў дыназаўраў на каўчэг Ной, а, папраўдзе, увогуле іх не было. У Святым Пісанні няма ні слова пра такое божае стварэнне, як дыназаўры, мяркуе баба Вера.

На балкон прыляцелі дзве божыя кароўкі. Паглядзеў Паўлік на іх, як, сеўшы на настуркі, спраўляюцца яны з тлёй (mszyca), што хоча знішчыць расліны — паціху аб'ядае лісце і кветкі.

— Бабця, у мяне, здаецца, няма алергіі на божых каровак? Яны голенькія, шэрсткі ў іх няма... Як яны захварэюць, дык ім на балконе клініку зраблю...

Вынес на балкон Паўлік кардонкі, стаў рыхтаваць бальніцу для насякомых. Шчаслівы — у яго ёсць свае звяркі!

Міра Лукша

[6 ☞]

— Сціхні! — крыкнуў намеснік хана. — Ты нічога не разумееш.

* * *

Далёка, на поўдні правінцыі, у малой хатцы, жыў Раман Точак. Стары і адважны рыцар, які ўсё жыццё хацеў стаць акцёрам.

— Сёння наведаю татараў. Дам ім усе мячы, дарма!!! — але дзе іх узяць? Дык можа... замест мячоў дам ім самагонку і ліверку з хлебам.

Раман Точак надзеў зброю і сеў на сваю старую кабылку. Ехаў ён Чорным Лесам, пра які напісалі аднойчы ў коміксе. Для ўсяе вёскі гэта была важная падзея, таму што ўся яна чытала гэты комікс.

* * *

Лес усё больш цямнеў і гусцеў. Раптам Раман Точак пабачыў новага хана Мінхена. За ім ішлі яго намеснік і Брыгіда.

Раман Точак падышоў да Брыгіды і спытаў:

— Чаму ты тут, разам з імі, малая?

— Бо новы кароль — неандэрталец, а я не ведаю, які гэта тып чалавека, — адказала.

— Дзіцятка мілае, і ты за імі ідзеш?

— Пайшоў ты адсюль, стары Точак! — усхваляваўся Мінхен.

— Прадайце мне гэтую дзяўчынку, — не адставаў стары рыцар.

* * *

Раптам, як з-пад зямлі, выскачыў Каліяр'еў са сваёй арміяй. Яны з лютасцю кінуліся на татараў. Змагаліся да абеду. Апошнія татары ўцяклі і некаторыя паламалі сабе ногі і хрыбты.

Брыгіда баялася русінаў і жорсткага Каліяр'ева. Яна думала, што зноў прыйшоў ёй канец.

— Прадайце мне гэтую дзяўчынку, — сказаў Раман Точак.

Русіны доўга думалі, аднак стары рыцар паказаў ім вантрабяную кішку з хлебам і самагонку.

— О-кей! — расслабіўся люты Каліяр'еў.

* * *

Стары рыцар і Брыгіда ехалі на старой кабылцы ўвесь дзень і ноч. У канцы спыніліся ля скрыжавання дарог. Там стаяў стары двор. Яны пастукалі ў дзверы. Прывітаў іх чалавек.

— Салют! — сказаў Раман Точак.

— Салют! — адказаў чалавек. Гэта быў баяр Стары Дуб з Белаборскага Краю. Ён дапытліва зірнуў на Брыгіду.

— Русіны аддалі мне гэту дзяўчынку за харчы, якія вёз я ў якасці падарунка пабітым татарам.

Стары Дуб-Белаборскі пляснуў у далоні.

— Гэта цудоўна! Ты ацаліў маю дачушку, якую калісьці ўзялі ў палон татары...

Пасля ўсе святкавалі.

Аднак найважнейшае тое, што Брыгіда зноў жыла ў Белаборскім двары з бацькамі.

Наталька Кандрацюк-Свярубская

Паэтычныя падарожжы з Віктарам Шведам і Святым Мікалаем

Ніхто не прадчуваў, што зацікаўленне паэтычнай творчасцю Віктара Шведа будзе такое вялікае. Першая сустрэча паэта з 5-6-гадовымі дзяцьмі і з невялікай колькасцю іх бацькоў (з прычыны ранніх гадзін) адбылася 27 лістапада 2002 года ў Самаўрадавым прадшколлі н-р 65 у Беластоку.

Паэтычная сустрэча праводзілася пад лозунгам „Уся Польшча чытае дзецям". Прыходзяць да нас чытаць вучаніцы Агульнаадукацыйнага ліцэя н-р 1 у Беластоку, выпускнікі нашага прадшколля, каб выклікаць у дзяцей захапленне паэтычным словам, фармаваць патрэбу кантакту з кніжкай, вучыцца ўспрымання мастацтва і яго перажывання, выклікаць актыўнасць дзяцей.

Успаміны Віктара Шведа і сённяшняя рэальнасць аказаліся жывой і вельмі блізкай тэмай. Дзеці, слухаючы Віктара Шведа, акуналіся ў свет маляўнічай прыроды, гумару і фантазіі. Малечы часам не згаджаліся, што „крот не можа жыць без акон у хаце", бо „калі толькі захоча можа іх сабе зрабіць". У іншай хвіліне задумоўваліся над лёсам малога хлопчыка Мікалая, які „чамусьці не можа быць святым". Якраз гэтая тэматычная блізкасць да Каляд, свята дзіцячай забавы і цацак, узбудзіла ў іх ахвоту да ўласных спантанных выказванняў у адрас аўтара. Вершы В. Шведа перапляталіся з вершамі, загадкамі і песнямі ў выкананні дзяцей. Сцэнічнае афармленне папаўняў паэтычны куточак: „крэсла ўспамінаў і сучаснасці", столік з акварыумам і „залатой рыбкай", што супадала з вершамі паэта „Скажыце мне, дзеці, з чаго робяць сеці?", „Чаму маўчаць рыбы?", „Чаму вада салёна ў моры?".

Завяршэннем паэтычнай сустрэчы было падпісванне аўтарам кніжак, якое не закончылася гэтага дня. Прысутныя запрасілі паэта на чарговую сустрэчу ў свеце казкі, вершаў, песень і танцаў — на „Мікалайкі" (6 XII) з фондам дабрачыннай акцыі пад лозунгам „І Ты можаш стаць Святым Мікалаем", якая супала з праектам „Каляровыя дні". „Чырвоны дзень" захапіў усіх яго ўдзельнікаў выступленнем дзяцей і паказам моды гномаў, Мікалайкаў і Мікалая. А ўзнагародай былі абдымкі Святога Мікалая і забава з ім, а таксама з бацькамі. „Мікалайкавыя" падарункі, чырвоныя ледзянцы ад выхавацельніц і чарговая сустрэча з Віктарам Шведам, які працягваў падпісваць дзецям свае паэтычныя кніжкі, былі прыемнымі і незабыўнымі акцэнтамі гэтага ўрачыстага дня. Асталіся трывалыя ўспаміны а таксама цеплыня ўва ўсіх сэрцах — малых і вялікіх.

Эва Д. Ступкевіч

Ліст у рэдакцыю

Еўрапейскі падыход

Шаноўная рэдакцыя!

Удзячны Вам за высылку (рэгулярную) асобнікаў „Нівы" для нашага Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Пецярбургу. Чальцы суполкі ахвотна чытаюць яе і абсуджаюць. Параўноўваюць з іншымі беларускімі газетамі. З „Голасам Радзімы" — тыпова савецкай, па характарыстыцы чальцоў — можна даведацца адно пра рыбную лоўлю або прачытаць розныя кепікі правінцыйнага густу. Ваша ж газета на дзіва „сталічная" ў лепшым сэнсе слова. З яе даведваемся аб падзелах у беларускім асяроддзі ў такім жа месце, як і наша, толькі падтрыманым правамі асобы. Прыемна адчуваць талерантнасць рэдакцыі ў асвятленні дзейнасці беларускіх суполак рознага накірунку, у асвятленні розных поглядаў. Крыху смешна чытаць пра тое, што „Ірак не ліжа боты ЗША", аднаго чытача: але гэта ягонае права не сачыць за поўнай інфармацыяй пра розныя аўтарытарныя кіраўнікоў. Адначасова ж друкуецца і супрацьлеглая, больш ураўнаважаная інфармацыя Вашых аглядальнікаў. Вось гэта і ёсць праява сапраўдна еўрапейскага падыходу да чытачоў.

Валянцін Грыцкевіч,
Старшыня Рады БГКТ
у Санкт-Пецярбургу

Арыгінальная мастачка

Дзіяна Астапюк-Янчук ад 1999 года пражывае ў Навасадах каля Гайнаўкі. Яна арыгінальная мастачка. Малюе алейнымі фарбамі. Найчасцей поўныя настрою пейзажы даліны ракі Нарвы і Белавежскай пушчы, каляровыя букеты кветак, партрэты жанчын. Малюе з натуры і з памяці, многія працы нараджаюцца пасля прагулкі па Белавежскай пушчы, якая яе зачаравала. Апошнім часам павышаную цікавасць праяўляе яна да жывёл — у прыватнасці, коней.

Найноўшыя карціны мастачкі характэрныя больш светлымі фарбамі ды багатай каларытнай палітрай, а таксама экспрэсіўнай тэхнікай.

Дзіяна Астапюк-Янчук мела дагэтуль пятнаццаць персанальных выставак. Найбольш у сямі гарадах у паўднёва-заходняй частцы нашай краіны (ад 1949 да 1999 года пражывала м.інш. у Аполі). У 2000, 2001 і 2002 гадах мастачка ладзіла свае выставы ў Гайнаўцы: у Музеі беларускай культуры ды ў Гайнаўскім доме культуры (ГДК).

24 лістапада арганізавалі яе персанальную выставу ў ГДК. На выставе былі прадстаўлены 62 алейныя працы.

Янка Целушэцкі

Культурны каляндар

Зараз жа перад Новым годам (паводле грыгарыянскага адліку часу) Падляшская маршалкоўская ўправа выдала чарговы каляндар культурных мерапрыемстваў у ваяводстве на 2003 г. Гэта каталог у больш за сто старонак, у каляровых вокладках, які інфармуе месяц за месяцам аб тым, якія прапановы з галіны культуры ў Беластоку і іншых падляшскіх гмінах мае намер рэалізаваць яна і падлеглыя ёй асяродкі (такія, як Ваяводскі асяродак анімацыі культуры). Аднак, у каталогу ёсць таксама і іншыя, якія, невядома чаму, апынуліся ў прапанове Маршалкоўскай управы, паколькі яны з прадпасылак чыста гмінныя. Для прыкладу: з календара не вынікае, чаму МУ „падцягнула" пад сваю дзейнасць Гмінныя дні сеніёра ў Карыціне (лістапад), Народны фэст у Нараўцы (май) ці Дні Гарадка (чэрвень). Такіх чыста гмінных ідэй ёсць у прапанове ваяводскіх чыноўнікаў шмат. Мабыць, нейкі „ваяводскі" ўдзел у гэтых мерапрыемствах і будзе. Не вынікае гэта, аднак, з інфармацыі аб арганізатарах. У большасці выпадкаў адказнымі за гэта будуць гмінныя асяродкі культуры, якія падлягаюць гмінным самаўрадам, а не ваяводскаму.

Маршалкоўская ўправа ахвотна падпісваецца і пад прапановамі Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Можа, значыць гэта, што возьме пад свае крылы арганізацыю трыманую да гэтай пары ў паняверцы беластоцкімі і падляшскімі ўладамі? Падобна можна было б спадзявацца асаблівай апекі над VIII Агульнапольскім конкурсам беларускай паэзіі і прозы (15 сакавіка — 30 кастрычніка), які рыхтуе Беларускі саюз у Польшчы (разам з „Нівай", хоць на гэта паказвае толькі ўспомнены ў календары адрас рэдакцыі, як можна зразумець, сядзібы і Саюза)...

Вернемся да мерапрыемстваў, рыхтаваных БГКТ. Незалежна ад таго, што старшыня таварыства цяпер член падляшскай управы, што таксама, мабыць, мела паказваць на асаблівую прыхільнасць ваяводскай адміністрацыі для падтрымкі беларускай культуры і, шырэй, меншаснай, то ўжо сама вокладка календара, напэўна, пра гэта не сведчыць. Відаць на ёй здымак „Курпянскага вяселля", тэатралізаванага мерапрыемства, арганізаванага Тэрэзай Падла, мінулагодняй стыпендыісткай папярэдняга маршалка Славаміра Згжывы.

Уважлівы чытач календара заўважыць таксама, што аўтары не пазбеглі памылак. Вось, у індэксе нас адсылаюць на 62 старонку, дзе маюць быць інфармацыі аб агульнапольскай канферэнцыі „Маркетынг у кіраванні культурнай установай". А на гэтай старонцы, ні на ніводнай іншай, такой канферэнцыі няма. І невядома, ці адбудзецца яна, ці не.

З больш цікавых інфармацый аб беларускіх культурных мерапрыемствах звяртае ўвагу факт, што сёлетнія Дні і Фестываль царкоўнай музыкі маюць праводзіцца ў адзін час (11 — 18 мая). Падобна, як летась, Фестываль мае арганізаваць Фонд „Muzyka Cerkiewna", а Дні — Stowarzyszenie „Miłośnicy Muzyki Cerkiewnej". Дзе яны будуць праводзіцца і хоць бы, уступна, што будзе іх атракцыёнам, так як і ў выпадку іншых мерапрыемстваў зафіксаваных у календары — немагчыма з яго даведацца.

Праўдападобна, выданне Маршалкоўскай управы мае служыць самім чыноўнікам, каб не пазабываліся, што запланавалі ў новым годзе. Напэўна, не забудуць пра чарговы выпуск „Музычных дыялогаў над Бугам" і фолькавых „З вясковага панадворка" ў Чаромсе. Бо якраз толькі аб тых беларуска-ўкраінскіх падзеях успамінае ва ўступе падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі. Дадае: „Вандруючы па Падляшшы можам заглыбіцца ў іншасці, чэрпаць з яго унікальнасці, убагачацца ягонай непаўторнай моцай".

(мах)

Фільмавы вечар

Канец года і падрыхтоўка да калядных святаў знясільваюць і стамляюць. Каб паправіць настрой, прапаную візіт у кінатэатр, але калі не маеце ахвоты выходзіць з хаты, раю наведаць пункт пракату відэакасет.

„Круг" (*The Ring*) — японская кінакарціна ў рэжысуры Хідэа Наката, аднаго з выдатнейшых рэжысёраў нашага часу, гэта прапанова для аматараў моцных уражанняў. Тым, што аглядалі „Крык" або фільмы Стывена Кінга, карціна спадабаецца. Пачынаецца ён ад размовы па тэлефоне дзвюх маладых дзяўчат на тэму дзіўнай відэакасеты: „Калі пападзе яна ў твае рукі, калі аглянеш яе, табе пазвоніць тэлефон і пачуеш, што за тыдзень памрэш". І гэта праўда...

Жанчына знаходзіць ў шафе труп дачкі з шырока адкрытым ротам і пераплоханымі вачыма. Такое паўтараецца часта. У таямнічы спосаб гінуць маладыя людзі з багатых сем'яў. Рэйко, прыгожая тэлежурналістка пастанаўляе раскрыць таямніцу дзіўнай касеты. Пераадольвае розныя цяжкасці, каб урэшце паглядзець яе. Але потым раздаецца званок...

„Няма вестак ад Бога" (*Sin Noticias De Dios*) — добрая камедыя з элементамі палітыкі. Рэжысёр і аўтар сцэнарыя Агусцін Дыяс Янес прапануе гульню ў сутыкненне двух светаў. Неба, пекла, анёлы, д'яблы і сапраўдныя людзі з вялікімі праблемамі паказаны тут з усмешкай, аднак рэальна выклікаюць не толькі смех, але і прымушаюць задумацца над жыццём.

Фінансавыя праблемы ў Небе (якое патрабуе добрай улады, бо Бог загінуў) і адсутнасць кандыцыянера ў Пекле даводзяць да парадаксальных сітуацый. Група непаслухмяных д'яблаў хоча ўчыніць дзяржаўны пераварот, мэтай якога з'яўляецца ўключэнне ў кола ўпраўленцаў Пеклам усіх прыгавораных (на Пекла) багатых бізнесменаў. На гэта не згаджаецца галоўны начальнік Пекла (у імя справядлівасці!)...

На экране пабачым Пенелопу Крус, Вікторыю Абрыль, Дэм'яна Бычыра і Фані Ардан.

„Вялікую гонку" (*Le Raid*) французскага рэжысёра Джамеля Бенсалы прапануе аматарам фільмаў з хуткім дзеяннем, прыгожымі дзяўчатамі і шыкарнымі машынамі, аб якіх можна толькі памарыць!

Чацвёра сяброў атрымоўвае ад свайго шэфа загад паназіраць за яго новай дзяўчынай Наталі. Місія мае праходзіць у найлепшай гасцініцы горада, што вельмі радуе юнакоў. Перспектыва бясплатных канікулаў падабаецца ўсім. Сітуацыя змяняецца, калі яны памылкова трапляюць не ў той што трэба пакой, і атрымоўваюць загад забіць прыгожую і багатую Элеанору. За гэта маюць атрымаць 4 мільёны долараў. Але не так проста выканаць загад, калі за імі сочаць сапраўдныя забойцы, а Элеанора аказваецца спрытнейшай, чым яе ворагі.

Хаця на экране не пабачым кіназорак, вядомых усім акцёраў, варта выбрацца ў кінатэатр, бо і аматары таксама ўмеюць паказаць майстэрства!

Паўліна Шафран

Чэрвень у жніўні

Горад Чэрвень. Тутэйшыя інтэлігенты ўжо вярнуліся да гістарычнай назвы і між сабой кажуць Ігумен. Слова Ігумен вымаўляюць сцішаным голасам.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Генадзь Матусевіч і яго разьба ігуменні — заснавальніцы горада

Сам горад не заахвочвае да сустрэчы і знаёмства. Спыняемся ў цэнтры ля Дома ўрада. Насупраць — Ленін у какетлівай позе гея. Першая думка, якая прыходзіць у голаў — адвярнуцца на пяце і з'ехаць куды-небудзь! Маразм угнятае ў зямлю. І яшчэ, каб было смяшней — на Савецкай вуліцы грыміць шэдэўр лесбіянскага гурту „Тату". Катэгарычны рытм музыкі таксама пад'юджвае ўцякаць:

— *Нас не догонят, нас не догонят!* — грыміць на палову вуліцы расійскае тэхна.

Нам мусова спыніцца. У горадзе жывуць Вольга і Генадзь Матусевічы.

* * *

Вольга і Генадзь жывуць, як звычайны жыхары Чэрвеня, у двухпакаёвай кватэрцы ў блёку. Іх блёк на ўскраіне горада, у цэнтры не ўмеюць паказаць, дзе тая вуліца. Тут дзесяць тысяч жыхароў. Ад цэнтральнай плошчы бягуць вуліцы з пасляяўрэйскай драўлянай забудовай. Архітэктура рэзка мяняецца. Калі з'едзем з галоўнай дарогі, сустрэнуць нас выбоістыя аўтакаляіны і іншы свет. Каб акрэсліць выгляд квартала, хлопцы знаходзяць параўнанне аж у Бразіліі — *фавэлі*. Там-сям блёкі віруюць ад несіметрычнага складу, здаецца — вось-вось грымнуць яны пад ногі. Расхлябанасць пабудовы тут проста мастацкая.

— А ёлкі-палкі! — хвалюецца Саша, таксама ашарашаны рытмам касых будынін.

Нашых гаспадароў няма дома. Яны на дачы, што на практыцы значыць — завіхаюцца каля капусты і бульбы. Яны — інтэлектуалы. Вольга — кіраўнік тэатральнага калектыву „Залатая пчолка", Генадзь — таленавіты жывапісец і скульптар.

Каб не траціць час, ідзем на пошту пазваніць. Каля блёкаў на лавачках выседжваюць бабулі, дзеці.

Дачка гаспадароў вядзе нас да галоўнай дарогі. Ідзем гуськом. Сцяжына ўецца між сланечнікаў, бульбы, буракоў, капусты. Уся вольная прастора ў квартале загаспадараная на агароды. Пад вокнамі растуць бульба, кукуруза, кругляцца галоўкі спелай капусты. Дзе-нідзе чарнеюць шкілеты ад фольгавых тунеляў. На балконах — вянкі цыбулі.

Яда проста ляжыць „на вуліцы". Нас уражвае этыка квартала — не абіраюць дагала ўсяе гародніны.

* * *

Ігумен вядомы з 1387 года. Заснавальніцай горада, як кажа легенда, была манахіня з Афона. Першы жаночы манастыр збудаваны на рацэ Ігуменцы, сярод багны. У пятнаццатым стагоддзі Ігумен лічыўся царкоўным горадам. У канцы XVI стагоддзя цэнтр воласці Мінскага павета Вялікага княства Літоўскага. Пасля падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 — у складзе Расіі. Два гады пазней імперыя надзяляе яго гарадскімі правамі, з гэтае пары сучасны герб горада: на блакітным полі срэбны букет, над ім — пяць залатых пчол.

У 1904 г. больш за 5,1 тыс. жыхароў, 664 дамы (з іх 28 мураваных), гарбарныя заводы (11 рабочых), млын, царква, касцёл, сінагога, 6 корчмаў, 2 кірмашы ў год, бальніца на 15 ложкаў, 6 пачатковых навучальных устаноў, чытальня, друкарня, аптэка, фатаграфія, 17 вуліц і завулкаў, якія асвятляліся 96 газавымі ліхтарамі.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Пошта

Варта прывесці і апісанне нашага любімага краязнаўцы Напалеона Роўбы:

Ihumień — niewielka mieścina powiatowa nad rzeką Ihumieńką i wielkimi błotami, które ongiś stanowiły jezioro, położone jest przy trakcie pocztowym z Bobrujska do Mińska, w odległości 65 wiorst od tego ostatniego. Ani pod względem historycznym, ani ekonomicznym, miasto to nie przedstawia nic ciekawego. Ludność w r. 1907 wynosiła zaledwie 5 390 osób płci obojej.

— Што меў на думцы аўтар? — гадалі мы сакрэтны сэнс запісу: *Ludność płci obojej?!*

* * *

На пошце мы мелі намер пазваніць дадому. Раней не пашанцавала дазваніцца ў Польшчу. Мабільнік Асі перастаў працаваць ужо ў Стоўбцах. Вячаслаў, які хацеў пазваніць з таксафона ў Мінск, нагнаў шумнага смеху. Тэлефануйце, калі ласка, — трэба, аднак, ведаць, што тэлефонны абсяг працуе на Стоўбцы. Далей немагчыма. Каб пазваніць у іншы горад, трэба ісці на пошту, заказаць размову, адчакаць сваё, а калі сувязь спрацуе, цешыцца ўдачай.

У Чэрвені мы кінуліся званіць у Польшчу. Заказалі размову, заплацілі грошы, чакаем... Урэшце клічуць у кабіну. Сувязь нібыта ёсць, але збіваецца пасля першага слова.

— Нажымайце кнопку! — крычыць жанчына з акенца. Яе заўвага напаўняе аптымізмам. Відаць, віна на нашым баку, не ўмеем карыстацца тэхнікай. Сорам! Цяпер *нажымаем* што трэба... аднак, сувязь далей рвецца. У канцы сама працаўніца ідзе ў нашу кабіну і цісне кнопку. Сувязь зрываецца.

У акенцы даюць здачу як за „зрэалізаваную размову". Ніхто не разумее прэтэнзій *падстаўленага* кліента. Плаці і прэч! — усё адно, ці пазваніў куды трэба — ці змарнаваў гадзіну ў нервах без жаданага выніку.

Хочацца тут зрабіць разборку — вядома — у абарону правоў спажыўца. Юрась ведае мясцовыя звычаі. Падманам вабіць на двор.

Абсурднасць сітуацыі павялічваецца. Перад вачыма высіцца магутны будынак пошты.

— З яе хоць ты на Месяц звані! — думаеш на аснове бачанага. Над дахам тырчыць яшчэ труба з цыліндрычным купалам.

Робіцца невыносна смешна і страшна!

— Гляньце, які файны пеўнік, — лагодзіць тон Юрась і як зачараваныя глядзім на трубу завершаную бляшаным пеўнікам.

І хоць нас таксама надзьмулі ў трубу, кідаем разборнічаць. Суцяшае думка: мы ж тут толькі праездам.

(Трэба справядліва адзначыць: Вячаслаў дазваніўся ў Беласток, Ані пашанцавала купіць юбілейныя паштоўкі з Коласам. На жаль, яна выкупіла ўсе паштоўкі... На пошце мелі іх па адным экземпляры.)

Ганна Кандрацюк

Памагаюць старэйшым

Моладзь з Гайнаўскай белгімназіі разам са сваімі настаўнікамі распачала ў 2002 годзе дабрачынную дзейнасць. Вучні пачалі наведваць жыхароў Дома міласэрнасці „Самаранін" з Гайнаўкі і памагаць ім.

Белгімназісты, якімі апякуюцца настаўнікі Ірэна Ігнатовіч, Галіна Іванюк і Бажэна Ляўчук, прыбіралі вакол дома міласэрнасці, наводзілі парадкі ў пакоях. Размаўлялі яны з жыхарамі дома і спявалі ім песні. Вучні заносілі ў „Самаранін" кніжкі са школьнай бібліятэкі. Старэйшыя асобы найахвотней чытаюць праваслаўную духоўную літаратуру і таму атрымалі кніжкі ў дары ад выдавецтва „Братчык" з Гайнаўкі. Бабулі і дзядулі разам з моладдзю глядзелі фільмы аб духоўным жыцці праваслаўных хрысціян і беларускіх народных абрадах.

Перад Ражджаственскім постам белгімназісты разам з жыхарамі „Самараніна" арганізавалі запусты. Вучні выступілі з артыстычнай часткай. Салісткі і гімназічны хор заспявалі песні. Найбольш публіцы спадабаліся народныя беларускія песні. У час пачастунку вучні селі за доўгі стол насупраць старэйшых асоб і слухалі цікавыя расказы. Вясковыя людзі задаволены ўмовамі ў доме „Самаранін", але надалей жывуць успамінамі, тужаць па мінулым, чакаюць, каб хтосьці іх наведаў. Белгімназісты для іх — вельмі мілыя госці.

— Вучні адчуваюць, што яны патрэбныя і таму ўсталяваліся добрыя адносіны з жыхарамі „Самараніна", — заяўляе арганізатар сустрэч настаўніца Ірэна Ігнатовіч. — Можа ў будучыні разгорнем дабрачынную дзейнасць на іншыя асяроддзі.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Жыхары дома і белгімназісты за застаўленым столам

Збамбілі балота

Успаміны Любы БЯЛАЙ з Беластока, народжанай у 1928 годзе ў Дзернякове.

У 1939 годзе немцаў у нас не было, толькі восенню прыйшлі рускія. Там, дзе цяпер *злеўня*, браму ім паставілі — такія калочкі з надпісам паміж імі; што там было напісана — не помню. Зышлася туды хіба цэлая вёска, а арганізавалі тое ўсё камуністы, якія іконы ў хатах скідалі; мо з пяцерых такіх у Дзернякове было: Карповіч, Храноўскія, а наша сям'я — ні туды, ні сюды.

Наша сям'я з парабкаў была. Прадзеды не мелі дзяцей і ўзялі пару парабкаў, якія з сабою пажаніліся — былі гэта нашы дзяды. Бацькі нашы дакупілі зямлі і ўжо саветы лічылі нашу сям'ю кулакамі. Адзін з нашай вёскі зайшоў на сход у Гарадок, залез на трыбуну і стаў нас абзываць кулакамі. А іншы пачуў гэта і адказаў, што мы з парабкаў і сям'я наша сама настаралася наша дабро. Гаварылі нам, што мы запісаны да вывазкі на ўсход, мы ўжо былі спакаваліся, але ніхто па нас не прыехаў.

З Дзернякова вывезлі дзве сям'і — спярша забіралі мужчын. Адзін быў солтысам, серадняком; калі ён пасля наведваў нашу вёску, гаварыў, што ягоныя найлепшыя сябры падпісаліся, каб вывезці ягоную сям'ю. А другі зусім бедны быў, але з братам у нязгодзе жыў. Зямлі ў нашай вёсцы саветы нікому не забіралі, таксама не арганізавалі калгаса.

Пры санацыі я хадзіла ў школу, якая была ў прыватнай хаце. Пасля, у 1938 годзе, пабудавалі ў нас новую школу. Калі яе здавалі, прыехаў войт і іншыя вышэйшыя чыны. Выступалі старэйшыя вучні, штось гаварылі. І высвянчалі школу, толькі не помню хто — ксёндз ці бацюшка. У тую школу хадзіла я год, а пасля два гады ў рускую. Вучылі ў ёй па-руску. Адзін год вучыў наш вясковец, а потым Кардаш з Меляшкоў. Невядома, якая ў іх была адукацыя, бо на царскую былі яны замаладыя.

Калі напалі немцы, рускія ўцякалі самаходамі і паяздамі: сем'і, войска, НКУС. Немец бамбіў і па шашы біў. Насупраць нашай вёскі збамбілі поезд з уцекачамі. Мая сястра пайшла туды паглядзець. Там ляжала руская раненая з дзіцём, якая прасіла каб іх або хаця самое дзіця забраць. Сястра пра гэта вечарам расказала, плачучы, а на золаку тата паехалі і тую жанчыну з дзіцём прывезлі дахаты; Маруся і Шурык Матвеевы яны называліся. У яе з пахвіны быў вырваны кусок мяса. Лекараў тады не было і нашы парылі рамонак і тую рану прамывалі; яна енчыла. Праз тыдзень прыйшлі немцы, яна прасіла лекара. Тата неяк з немцамі дагаварыліся і прывялі нямецкага лекара; а ў яе ўжо чорныя пухіры былі. Ён зрабіў укол, выйшаў у сені і сказаў тату папольску, што нічога ўжо не будзе. І яна пасля дня-двух памерла і мы яе пахавалі ў Гарадку.

Перад смерцю дала яна нам адрас свае маці і мужавых бацькоў. Мы перапісваліся з яе маці Параскоўяй Каралёўнай; яна прасіла прыслаць ёй унука. Але тата мой не хацеў гэтага рабіць, думаў — застарая ўжо. І так той Шурык у нас жыў. Пасля вайны выявіўся яго бацька і стаў хадайнічаць за вяртанне сына. Міліцыя да нас прыходзіла, каб Шурыка забраць, а ён не хацеў нікуды ад нас ехаць, хаваўся перад міліцыяй. Усё ж такі мы вырашылі адаслаць яго бацьку... І насільна яго пацягнулі; ён плакаў і мы ўсе плакалі.

Прайшло мо чатыры-пяць дзён пасля ад'езду Шурыка і мы атрымалі вестку, што Шурыкаў бацька загінуў у выпадку. Тата мой адразу паехаў у Беласток, каб даведацца, ці Шурык яшчэ ў Польшчы, але яму адказалі, што Шурыка ўжо ў Польшчы няма. Мы яшчэ перапісваліся з яго бабай, але ён не хацеў нам пісаць — так ён моцна загневаўся, што мы аддалі яго быццам у сірочы дом.

Уцякаў на ўсход і загадчык НКУС з Заблудава. Жонку і сына ён успеў загрузіць на самаход, а сам яшчэ хацеў забраць дачку, якая тады на летніку была. І яны ўжо не ўспелі выехаць, толькі асталіся ў Дзернякове жыць. Немцы яго ўскрылі і загадалі ў Міхалова мельдавацца. Ён у вёсцы гаварыў што ходзіць у Міхалова, але заміж таго ён пачаў хадзіць кругом і арганізаваць партызанку. Аднойчы, калі ён быў у дзядзькавай хаце, немцы акружылі хату і забралі яго разам з дзядзькам...

Яго дачка асталася ў нашай цёткі. Яе сыны, Міхал і Аляксандр Храноўскія, якіх імёны пасля вайны прысвоены школе ў Гарадку, пайшлі ў партызаны і загінулі. У 1959 годзе знайшлася маці тае дзяўчыны, прыязджала ў Дзернякова. Цётка тую дзяўчыну выгадавала, узяла ёй у сваю хату прымака... А пасля яны яе з хаты выгналі і яна ў Ялоўцы дажывала.

Яшчэ адзін рускі ў нас быў, ён у партызаны пайшоў, у Майдане дзяўчыну згвалтаваў і яго самыя партызаны забілі.

Немцы вывозілі дзяўчат у Германію, а хлопцы ўцякалі да партызанаў. Аднойчы тыя хлопцы, сярод якіх быў і мой брат, рашылі здацца немцам; мой брат пра здачу нічога не ведаў і стаў уцякаць. Немцы стралялі па ім, але жывым астаўся. Хлопцы, што здаліся, тлумачыліся, што партызаны іх прымусілі ісці ў лес. Пецярых іх забралі і вывезлі ў Германію; пасля вайны ўсе яны, апрача аднаго, вярнуліся. А мой брат да канца вайны партызаніў.

Мне, каб не вывезлі ў Германію, солтыс сказаў стаць на працу ў лес. Там нашым загадчыкам быў мужчына з Папоўкі. Аднойчы ён сумна сказаў нам, што можа ён ужо апошні раз з намі. І так было.

Зімою 1943 года партызаны ўзарвалі каля Дзернякова поезд, на якім ехала на ўсход каля паўтысячы нямецкіх сапёраў, з якіх каля двухсот тады загінула. Немцы хацелі паліквідаваць навакольныя вёскі, але прыехаў нейкі важны нямецкі спецыяліст і сказаў, што тут вяскоўцы ні пры чым, бо гэта работа высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Восенню 1943 года на станцыі ў Валілах стаяў нямецкі транспарт. Той транспарт меў збамбіць савецкі самалёт, а наводзіць яго мелі партызаны. І так атрымалася, што заміж таго транспарту самалёт збамбіў балота каля Дзернякова, на якім тады жанчыны разаслалі лён; мабыць лётчык думаў, што гэта эшалон. Дзве бомбы ўпалі і на нашу стадолу, якая занялася гарэць, але тата хутка залез на яе з вядром вады і загасіў.

Калі рускія гналі немца, немцы ў нашай вёсцы на пяць дзён спыніліся. Загадалі нашым вяскоўцам сабрацца ў школу, але нехта бачыў, як тую школу падмінавалі. І амаль усе ў лес паўцякалі; і я з канём, а мама з каровамі. У лесе прасядзелі амаль два тыдні; баёў у нас не было. Пасля рускія сапёры размінавалі школу.

Перад выбухам вайны саветы забралі ў армію васьмярых хлопцаў з нашай вёскі, народжаных у 1920 годзе. Адзін з іх вярнуўся хворы туберкулёзам і ў 1946 годзе памёр. Другі пасля вяртання загінуў у выпадку. Усе апошнія не вярнуліся і з народжаных у 1920 годзе ў нашай вёсцы хлопцаў не астаўся ніхто.

Мой брат, як прайшоў фронт, запісаўся быў у міліцыю, але тата настойваў, каб ён, адзіны сын, выпісаўся. Баяўся за яго, бо акоўцы хадзілі. І брат выпісаўся з міліцыі. Аднойчы зайшлі ў нашу хату акоўцы, крыху каўбас узялі і пайшлі далей. Брата тады ў хаце не было, у суседзяў гуляў у карты. І хтось з ягоных калегаў падказаў акоўцам пра яго. Яны тады брата моцна пабілі, вярнуліся ў нашу хату, паведамілі пра здарэнне, усё ў нас зрэвідавалі, забралі ровар, рускі патэфон, сястрыну сукенку і касцюм. А тата з братавай жонкай ледзь прывялі яго. Калі брат акрыяў, пайшоў на службу ў УБ.

Пасля вайны з Дзернякова ў СССР выехала адна сям'я, сям'я майго дзядзькі. Ён пры немцы падсолтысам быў і баяўся аставацца ў сваёй вёсцы. І другі гаспадар быў запісаўся, заехаў ужо на станцыю, але раздумаўся і вярнуўся.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Прывезлі куфэрак грошай

Успаміны Мікалая БЯРНАЦКАГА з Бернікаў, народжанага ў 1912 годзе.

У бежанстве наша сям'я была ў Самарскай губерні, у вёсцы Кропаўка. Людзі там збожжа сеялі, найбольш пшаніцу, а жыта толькі для саладухі або кіслушкі; так там называлі самагонку. Калі адпраўляліся ў млын, рыхтавалі шэсць фурманак, але пад пляндэкамі. Коней да фурманак прывязвалі і такой калонай ехалі. Калі намалолі, муку сыпалі ў *амбар* і ўсю зіму булкі пеклі; што трэці дзень булкі пеклі.

Зямлю на душы давалі. Калі хто нарадзіўся, то ўчастак зямлі давалі, а як паміраў, то забіралі. Сланечнікаў і гарбузоў па некалькі гектараў сеялі; стораж там быў і пільнаваў ад іншых.

Мама дома была, а тата да сталяркі хадзіў, кадушкі вырабляў. Калі б не рэвалюцыя, то не вярнуліся б. Тата меў грошы і ўжо мелі купляць дом на станцыі. Тату тры разы выклікалі, але людзі асцерагалі. Давай мы ўцякаць.

Ехалі таварным вагонам цэлы месяц, у тупікі нас заганялі. Ежу мелі з сабою. У Стоўбцах нас крыху трымалі, але нічога не забралі, бо нічога з сабою не мелі. Прыехалі ў Гродна, а з Гродна дахаты. А тут усё голае. Прывезлі з сабою куфэрак грошай. Керанцы як карты былі, белыя, але ўжо нічога не вартыя. І так наша багацце прапала, а тыя грошы ўжо пры камуне згарэлі ў пажары разам з нашай вёскай.

Нашы будынкі стаялі, у іх жыў татаў сваяк з Гродна, ледзь яго выкурылі. Тата са старэйшым братам пілавалі, па маёнтках на заробкі хадзілі. Сеялі і штораз больш усяго прыбывала. Памаленьку разжываліся.

У школу я хадзіў у Бернікі, па хатах школа была. Два настаўнікі вучылі, мужчыны са Шлёнска — добрыя былі. Я ў школу мо тры гады хадзіў, але мова мяшалася і праз гэта давялося паўтараць класы. А як не ішоў у школу, то гуляў на вуліцы. А як падрос, то венікі рабіў, то тое, то сёе.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Павесіць на цвік гісторыі

Нядаўна літаратурны свет адзначаў двухсотгоддзе нараджэння французскага класіка Аляксандра Дзюма (бацькі), аўтара слынных рамантычных аповесцей на гістарычныя тэмы, з якіх найбольш цікавыя „Тры мушкецёры" і „Граф Монтэ Крыста". Гаворыцца, што ён за сваё жыццё напісаў каля шасцісот кніг. Гэта, аднак, менш важнае, а важная яго заява, што ягоныя кнігі павінны быць павешаны на цвік гісторыі. Гэта дзіўна, бо ўсе ягоныя аповесці з'яўляюцца фантазіяй і фікцыяй і гістарычных фактаў там столькі, што кот наплакаў. Чытачы могуць быць зацікаўлены ягонымі сенсацыямі, аднак сапраўдны патрыёт і разумны чалавек будзе чытаць кнігі аснаваныя на фактах і сапраўдных перажываннях душы і сэрца.

Мы, на Беласточчыне, маем на шчасце сваіх слынных пісьменнікаў і паэтаў, якіх праўдзівыя кніжкі павінны менавіта быць павешаны на цвік нашай роднай гісторыі. Гэта: наш гонар Сакрат Яновіч (яму належыцца Нобелеўская прэмія, як слушна калісьці на гэтую тэму пісаў Васіль Петручук), Віктар Швед, Ян Чыквін, Яўген Мірановіч, Васіль Петручук і пакойны Мікалай Гайдук. Пра нашу мінуўшчыну цікава піша ў „Ніве" і Мікалай Капчук. Таксама сэрца цешыцца, што рэдакцыя „Нівы" мае адданых і здольных карэспандэнтаў у глыбінцы, сярод каторых першае месца ў мяне займае Віктар Бура, усім вядомы беларускі патрыёт і свой чалавек. Таму варта, каб мы духам не падалі і смела маглі сказаць, што і кнігі нашых беластоцкіх беларусаў, якія ўзбагачаюць нашу гісторыю і культуру, смела можна павесіць на свой „цвік роднай гісторыі". У іх адны факты і праўда, хаця ведаем, што праўда часта вочы коле.

Мікалай Панфілюк

Музейны фонд

Грамадскі камітэт пабудовы Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы праводзіць збор грошай на пабудову музея. Ахвяраванні на пабудову музея (у польскай і замежнай валютах) просім пералічваць на рахунак: **PKO BP S.A. O/ Hajnówka, nr konta: 26 10201332 100120228.**

Спіс чарговых ахвяравальнікаў:

5 103. Ян Карчэўскі (Гайнаўка) ..... 24,00 зл.
5 104. Юры Панасюк (Гайнаўка) ..... 68,00 зл.
5 105. Ірэна Парфянюк (Гайнаўка) ..... 58,00 зл.
5 106. Галіна Рамашка (Беласток) ..... 50,00 зл.
5 107. Яўгенія Палоцкая (Беласток) ..... 50,00 зл.
5 108. Васіль Петручук (Беласток) ..... 24,00 зл.
5 109. Ахвяраванні са скарбонкі ў Музеі ..... 181,80 зл.
5 110. Панцеляймон Мароз (Гайнаўка) ..... 44,00 зл.
5 111. Юры Балтрамюк (Гайнаўка) ..... 68,00 зл.
5 112. Анастасія Цімашук (Гайнаўка) ..... 50,00 зл.
5 113. Пётр Нікіцюк (Гайнаўка) ..... 10.00 зл.
5 114. Славамір Кулік (Гайнаўка) ..... 54.00 зл.
5 115. Уладзімір Асіпюк (Чыжыкі) ..... 20,00 зл.
5 116. Пётр Германюк (Аўгустаў) ..... 50,00 зл.
5 117. Галена Тапалянская (Трасцянка) ..... 100,00 зл.
5 118. Ахвяраванні са скарбонкі ў Музеі ..... 108,00 зл.
5 119. Луцыя Кубіца (Варшава) ..... 10,00 зл.
5 120. Пётр Грыцук (Беласток) ..... 50,00 зл.

Дзякуем.

Наш адрас: **Społeczny Komitet Budowy Muzeum i Ośrodka Kultury Białoruskiej, 17-200 Hajnówka, ul. 3 Maja 42, tel. (085) 682 28 89.**

Новае ў гайнаўскіх пажарнікаў

Агрэгаты для кіслародатэрапіі, спецыялістычныя насілы для перамяшчэння параненых у дарожных аварыях людзей, асабліва асоб з пашкоджаннем хрыбетніка і шыйных пазванкоў (пацярпелым накладаюць цвёрды гарсэт), а таксама артапедычныя дошкі для транспарту параненых ды прафесійныя перавязачныя матэрыялы атрымалі пажарнікі з Павятовай камендатуры ПСП у Гайнаўцы. Гэтае тэхнічнае абсталяванне за суму 4 тысяч злотых для перадмедычнага выратоўвання купіў гайнаўскі Інспектарат ПЗУ. Яно дазволіць ратаваць людское жыццё перш чым на месца здарэння прыедзе спецыялістычная медыцынская дапамога. Як вядома, з кожным годам расце лік дарожных аварый.

Гэта не першы дар гайнаўскай страхавой фірмы. Нядаўна ПЗУ купіў добраахвотнай пажарнай камандзе з Нараўкі мотапілу, неабходную пры ўстараненні зламаных або вывернутых прыдарожных і прыдамашніх дрэў.

Апрача гэтага Інспектарат ПЗУ ў Гайнаўцы прыходзіць з фінансавай дапамогай у арганізаванні павятовых спартыўна-пажарных спаборніцтваў, а таксама турніраў пажарных ведаў ды пластычных конкурсаў для моладзі.

Янка Целушэцкі

Залаты медаль „Пронару”

Фірма „Пронар” з Нарвы (Гайнаўскі павет) прывезла залаты медаль з кірмашу „Польагра-Фарм”. Яна атрымала яго за трактар 1025. Ён, між іншым, не спальвае многа гаручага ды мае канкурэнтную цану (83 700 злотаў).

На „Польагры” высокую ацэнку атрымалі таксама прычэпы, якія выпускае „Пронар”. Краёвая рада грамадскага страхавання прызнала ім сертыфікат бяспекі, таму што спрыяюць абмежаванню выпадкаў у час працы. (яц)

Навагодні баль у Варшаве (па старым стылі) — 11/12 студзеня 2003 г. у гадз. 21⁰⁰ — 6⁰⁰. Інфармацыя: вул. Гагарына 15, Варшава, тэл. 851 39 66, факс 858 95 01 (11⁰⁰ — 18⁰⁰).

Хахлы

Часта да нас прыязджаюць на гандаль жыхары Беларусі. Я лічу іх патомнымі беларусамі і заўсёды прапаную ім купіць „Ніву”. Аднак яны, за выключэннем адзінак, не хочуць яе купляць, бо лічаць яе занадта дарагой. Хаця не ў тым справа, бо яны, так як і нашы людзі, не цікавяцца роднай мовай. Адно толькі цешыць, што з намі яны гутараць па-нашаму. Гавораць аднак, што яны не беларусы, але хахлы; мо гэта і праўда. Бо колішняя назва *хахол* абазначае павешаную на дрэва нейкую анучу для страшэння вераб'ёў і іншых шкодных птушак. Калі вецер дзьме, хахол заўсёды абарочваецца згодна з ветрам. Так і мы, як той хахол, заўсёды ідзем з ветрам, а ніколі насупраць. І куды вецер падуе, туды і мы спяшым. І маем вынік: нашы ўнукі і праўнукі не хочуць з намі гаварыць не толькі па-беларуску, але нават і па-хахлацку.

Мікалай Панфілюк

У кармушку любіць заглянуць і кот

Дапамагчы зімою

Бадай пяць гадоў запар не было зімы і з тугою прыгадваем колішнія копныя снягі, якія залежваліся да канца сакавіка. Дзе-нідзе надувала горку і каля яе поўна было дзяцей з санкамі...

І сёлета дачакаліся сапраўднай зімы; не ўсюды белай, але ўсюды марознай. Чаму так дзеецца? Таму, што ў апошнія гады памяняўся клімат і не толькі зімы цяпер, але і весны іншыя. Няма таго пахучага прадвесня, калі раптоўна пускалі снягі і ўсё гуртам вярталася да жыцця. Іншае цяпер і лета, іншая і восень, пад канец якой можа наступіць зіма, а можна яе, сапраўднай, марознай, і не дачакацца. У людской памяці асталіся і г.зв. зімы стагоддзя, якія выступілі ў пачатку і канцы 70-х гадоў. Асадкі снегу паралізавалі ўсялякі рух у краіне, адрэзваючы людзей ад свету. Здараўся і саракаградусны мароз, які расколваў дрэвы і сталёвыя чыгуначныя рэйкі.

Зіма пачалася ў лістападзе: памарозіла, прысыпала нямнога снегам, адпусціла, а пасля зноў штораз мацней сціскала марозам, які яшчэ можа нам добра дацца ў знакі, і то не толькі людзям. Штогод ад марозу памірае ў нашай краіне каля 200 асоб. Ужо ў пачатку лістапада, першай смяротнай ахвярай марозу ў нашым ваяводстве стаў 57-гадовы селянін з Лапухоўкі ў Нарваўскай гміне, які пасля выпіўкі заснуў у полі.

Зіма галоўным чынам дакучае ўсім птушкам і лясной звярыне, бо ім настаў час голаду. Зямля замерзла, а азіміны прыкрыў снег. Цяжка курапаткам, якія не паказваліся на працягу доўгіх гадоў пасля трагічнай для іх зімы 1979 года. Цяпер, калі яны крыху адрадзіліся, паяўляюцца нават у людскіх паселішчах. У марозныя ночы заграбаюцца яны ў снег і прытуляюцца да сябе, каб так перетрываць найзімнейшую пару.

Каб аблягчыць птушкам, якія жывуць сярод людзей, зімовае пражыццё, моладзь і дзеці робяць кармушкі, якія мацуюць на балконах і дрэвах. Напаўняюць іх зернем, хлебам, шкуркамі саланіны і птушкі ахвотна карыстаюцца гэтай дапамогай, асабліва сініцы. У лютую зіму менавіта сініцам найцяжэй, бо яны прывыклыя да аднаго месца, якога на працягу цэлага года не пакідаюць; тады многа іх гіне. Лунаюць яны па наваколлі, разам з дзятламі, выглядаючы нашых кармушак і вісячых кавалкаў саланіны. Невялікія птушкі патрабуюць адносна больш яды ад вялікіх; сініца з'ядае за дзень больш, чым сама важыць.

Перад намі яшчэ шмат зімы. Ці з дапамогай той галоднай звярыне і адубелым ад холаду птушкам пойдуць усе тыя, якія пры іншай нагодзе галосяць, што прырода з'яўляецца вялікім багаццем краіны? Паляўнічыя арганізуюць сумесныя выезды на свае паляўнічыя ўчасткі з мяшкамі поўнымі аўса, пшаніцы і бульбы для дзікоў. Спадзяюся, што і ў школах падумаюць пра прагулкі ў лес не толькі на санкі, але і дзеля ратавання тых, якія чакаюць нашай дапамогі.

Міхал Мінцэвіч

Дзень сеніёра

Штогод Гмінная ўправа ў Чаромсе арганізуе сустрэчу з пенсіянерамі. Летась Дзень сеніёра адзначаўся 17 лістапада. Зала Гміннага асяродка культуры была запоўнена па апошняе месца. Прысутнічалі пенсіянеры з Чаромхі-Станцыі і навакольных вёсак.

Пасля афіцыйнага выступлення войта запрошаным пенсіянерам былі ўручаны ганаровыя значкі. Затым на сцэну выйшаў ансамбль „Rewers”, які выканаў некалькі папулярных песень. Пасля выступілі „Хлопцы-рыбалоўцы” з Рыбалаў. Песні ў іх выкананні вельмі спадабаліся жанчынам, асабліва бабулькам, паколькі напаміналі ім маладосць. У перапынку паміж песнямі і танцамі жанчыны з Дашоў зарэкамендавалі публіцы сцэнку „Вячоркі”, якая вярталася да традыцыі даўніх пакудзелляў.

Леташні Дзень сеніёра ў Чаромсе прайшоў паспяхова і ў сардэчнай сяброўскай атмасферы. Кожнаму ўдзельніку арганізатары прызначылі шакалад з арэшкамі. Варта адзначыць, што грашовую ўспамогу арганізатары атрымалі ад Прадпрыемства чыгуначнага рухомага саставу.

Уладзімір Сідарук

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk”, ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2003 r. upływa 5 marca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Ніўка

http://www.anekdotov.net/

Факты і высновы

Нічога без нас!

Пасля самаўрадавых выбараў старшыня ГП БГКТ увайшоў у склад ваяводскай управы. І з ходу спазнаў смак беластоцкага панавання. Як толькі атрымаў блізкі сэрцу дэпартамент культуры, беларусалюбныя канібалы абрынуліся на новаспечанага ўпраўленца апазіцыйным наступам:

— Камуняка! Лукашыст! Усе грошы ўгробіць у БГКТ!

Прыціснуты да сценкі, Ян Сычэўскі пакляўся публічна: ніводнага грошыка для БГКТ!

Вось табе і „нічога без нас". З „намі" — таксама нічога.

Сідар Макацёр

Адгаданка



Запоўніце вызначаныя дарожкі адгаданымі словамі (у дужках названы першыя літары іх). У светлых палях атрымаецца рашэнне адгаданкі.

1. выдатны поспех, бліскучая перамога (Т), 2. артыст, які паказвае фокусы (Ш), 3. вытворца павуціння (П), 4. варунак (У), 5. афрыканская дзяржава з Акрай (Г), 6. храбры чалавек, які здзяйсняе подзвігі (Г), 7. белае пакрывала залацістага піва (П), 8. важны раённы цэнтр на Гродзеншчыне (Л), 9. сяброўка шпагі і шаблі (Р).

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, разыграем кніжныя ўзнагароды. (Ш)

Адказ на крыжаванку з 45 нумара

Гарызантальна: Ліван, ракіроўка, Памір, атака, зло, пятніца, дзесяць, два, алыча, Фрэір, адзіночка, нацёк.

Вертыкальна: квартал, лікёр, „Ніўка", рамантыка, авансцэна, плява, акцёр, зад, ода, верніца, адзін, Фучык.

Рашэнне: **Дзявочы век, як макаў цвет**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Новы год на новай вуліцы

Вуліца даўно ўжо новая. Нават і не вуліца, а раз'езджаная, гліністая дарога, а наўкол яе — хаты. І не хаты, а катэджы. На малюпасенькіх падворачках (кожны метр даражэй ці не як у Лос-Анжэлесе), а кожны сантыметр выкладзены косткай — штучным каменнем. Там і кветачка, там і вішанька, а найбольш дрэў, калі ўжо — вечназялёных. Мода такая. Туя, лістоўніца, сібірская елка... Або гонкія, або пакручаныя карлікі. Ну, модна. Словам — у хатах, і за хатамі — як у шклянцы. Толькі пад хатай, на вуліцы — не як на сваім. Хай горад робіць што трэба. Вуліца ж гарадская. А калі нават і чысцей, цвярдзей, дык лісця ці снегу не хочацца адграбці...

Запрасілі мяне з Агатай нашы старыя знаёмыя з Гарадоцкае гміны. Жывуць у Беластоку ўжо гадоў дванаццаць. Хату адгрохалі, калі яшчэ мелі за што. Цяпер было б цяжэй, калі б увогуле хацелася закапацца ў паперах ды будаўнічых матэрыялах. Асабліва тыя паперы, акты ўсялякія — не на нармальную чалавечую галаву.

Заселі мы за навагодні стол. Ох, як хораша! Нідзе не цісне (можа, крышку пінжак, ды толькі крышачку — мабыць, патаўсцеў я трошкі пад старасць...), нідзе не дзьме. Усе клопаты і праблемы трэба пакінуць за сабою, не валачы ў новы год. Адзін аднаму прынёс падарункі, адзін аднаго хваліць — усе харошыя, чысценькія, можа, толькі нашы жанчыны чутачку прытомленыя — стараліся. Мужыкоў нас шасцёра, кабетак столькі ж, не лічачы аднае ўнучкі гаспадароў. Дзяўчына прыхварэла, і нікуды на Новы год не пайшла, але крышку пасядзела за сталом.

Бім-бом! — б'юць куранты. Новы, 2003 год вітаем! І не так адны з адныміі, а ўсе з тэлевізарам. З тэлевізарам — з усім светам. Круціцца зямля, і ўсе народы разам з яе рухам памаленьку ўваходзяць у Новы год. А мне ўжо пачынае трохі ў галаве круціцца...

Пайшоў я шукаць спакойнага месца, каб з сабою справіцца. Туды сунуўся, туды — нідзе, якасьці, няма таго месца. Мабыць, зусім я, стары дурань, ад шампанскага сп'янеў?!

— Дзядзечку, не туды вы папалі! — азвалася Марылька, з абвязаным горлам, калі я запутаўся на калідоры на першым паверсе вілы. — Ідзіце туды, туалет там, для гасцей.

А я, асёл, замест уверх, паплёўся ўніз. І зусім як дурны зрабіўся.

Дзе тыя залачоныя клямкі? Дзе пахучы снежна-белы унітаз, валахатыя зялёныя дыванкі перад ім? Куды я трапіў?

Сеў я на той каравы унітаз, ледзь ачомаўся. Значыць, не паспелі кончыць яны свае велічнае хаты. Ды хоць маглі б прыбраць крышку!

Куды мне трэба ісці? От, вмордзежа! Чую — сябры весяляцца, звоняць келіхі... Іду на гук. І зноў трапіў на ўнучку гаспадароў.

— Ідзіце на першы паверх, там пакоі для гасцей.

— А тут што? Яшчэ не кончылі? — падзівіўся я на абдзерты пакойчык Марылькі.

— Не, мы тут проста жывем.

Падняўся я па пушыстым дыване, раскладзеным на лакіраваных ўсходах, на першы паверх. Тут усё аж льснілася. І з цікаўнасці пасунуўся на другі — на падстрэшак. А там весяліліся кватаранткі-студэнткі.

На першы паверх я вярнуўся праз нейкі час, ужо без сумненняў і здзіву, вельмі вясёлы.

Вандал Арлянскі

Шышкавая рэформа

У лесе мінаў чарговы год адрачэнняў.

— Ой, папраўдзе, і гэты год быў ненайлепшы, — падумаў мядзведзь Сандар Жоржавіч у сваёй бярлозе, у якую падаўся быў на заслужаны зімовы адпачынак. — З-за гэтых турбот і заснуць не магу. Што ж тут рабіць, каб задаволіць лясны гэты мой люд?

У гэту хвіліну, невядома чаму, падумаў аб сяброўцы ўселяснога кіраўніцтва па справах раўнапраўнасці парнакапытных і няпарнакапытных, лані Гаўрусісе, яе гібкіх путавых костачках, павейных доўгіх веях і нясмелым паглядзе.

— Ох, Гаўрусіха, як жа ж мне дапамагчы майму грамадству? Майму народу? Як памагчы?

Гаўрусіха, якая прабягала непадалёк паляны, раптам спынілася, быццам нейкі снежны скрып пачуўшы. Ды не прыкмеціла ні лесніка, ні браканьера, ні іншае двухногае істоты.

— Не, гэта ж не снег, — задумалася на хвілінку, усё ж, настаўляючы вушы.

І фактычна. Гэта на паляну даляцелі думы Сандара Жоржавіча. Перасковалі яны з-пад кусціка пад кусцік, і рэхам даляцелі да вушэй лані: „Як памагчы майму народу? Як памагчы?"

Лань, кранутая прадчуваннем, тым, што рэха ёй падказала, замест ва ўселясную свіран-жытніцу па сваю дзённую долю сена, падскочыла ў бок мядзведжай бярлогі.

— Ах, мой мядзведзь, вось я ўжо і тут, — прашаптала на парозе.

— Заўсёды на цябе можна разлічваць, дарагая сяброўка. Ты ведаеш, калі трэба быць у адпаведным месцы. Гэта добра, лань мая ты, дарагая таварышка.

Не трэба было больш слоў. Лань, жонка вядомага аленя Гаўрухі, ведала, што Сандар хоча памагчы, хоча штосьці ўчыніць дзеля ляснога люду.

— Можа, вось, так зрабіць... Як воўк з Уладзімірскага лесу, паразмаўляць з кожным паасобку, разведаць патрэбы... Хай паскардзяцца, панаракаюць. Хай пабачаць, што я з імі, бліжэй да іх, — мядзведзь кансультаваў свае думкі з трымцячай ад увагі ланню.

— Э-э-э... — нясмела пачала Гаўрусіха. — Гэта ўжо было. Падумаюць, што робіш усё гэтак, як воўк, што пераймаеш Нятупіна. А ты ж ёсць арандатар нашага лесу, наш арандатар.

— Ну! — падумаў мядзведзь.

— Ведаеш, думаю так сабе... — лань з прыемнасцю тыкала шэфу. — Можа цяпер, зімой, у свірне за пуд падлы ці пуд разнасортных сушак замест плаціць дзесяццю шышкамі — плаціць адной? Люд ахопіць удзячнасць, што не будзе патрэбы насіцца з гэтымі шышкамі...

— Га? Люд будзе ўдзячны? Ну, так, аблегчу ім жыццё. Так. З нагоды Новага года абвяшчу новы шышкавы дэкрэт: адна шышка за пуд. Хай так будзе. Ну, нашто насіць столькі шышак?

І мядзведжае слова адразу стала фактам. Лань, аднак, не выходзіла з сядзібы Сандара Жоржавіча. Вавёрка Кацюша, якая заўжды ведала ўсё, чаго і не трэба было, панесла па лесе:

— Мядзведзь з ланню. Хі-хі-хі. Мядзведзь і лань!

І замест эканоміць шышкі на далейшую лютую зіму, угрызалася ў іх з гарачымі шчокамі і ўзнятаю кітай.

МакХолад

ISSN 0546-1960